# БЕЛАРУСКІ НАРОД
# супроць
# ПАПОЎ і РЭЛІГІІ

ФАЛЬКЛОРНЫ
ЗБОРНІК

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЄДНАЙЦЕСЯ!

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
СЕКЦЫЯ ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРА

# БЕЛАРУСКІ НАРОД СУПРОЦЬ ПАПОЎ І РЭЛІГІІ

## ЗБОРНІК ФАЛЬКЛОРНЫХ ТВОРАЎ

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
І З ПРАДМОВАЙ
АКАД. Н. М. НІКОЛЬСКАГА

ВЫДАВЕЦТВА АН БССР
МЕНСК 1939

Зборнік „Беларускі народ супроць папоў і рэлігіі" разлічан на актыў антырэлігійнікаў, прапагандыстаў, для школьных і клубных бібліятэк, для рабочых і калгасных клубаў, гурткоў мастацкай самадзейнасці і для масавага чытача.

Зборнік склалі навуковыя працаўнікі Інстытута гісторыі З. В. Галубок і А. К. Карэчыц.

## ПРАДМОВА

Выпускаючы гэты зборнік фальклорных твораў, Інстытут гісторыі імкнецца аказаць сваю пасільную дапамогу працаўнікам на адным з важнейшых фронтаў палітычна-асветнай работы—на фронце барацьбы з рэшткамі рэлігійных уяўленняў і абрадаў, барацьбы за пабудову новага, соцыялістычнага светапогляду.

Трэба яшчэ і яшчэ раз паўтарыць, што задача антырэлігійнай прапаганды ніякім чынам не знімаецца тым фактам, што ў Саюзе ССР знішчан капіталізм і атрымаў перамогу соцыялістычны лад. „Апошняя знешняя сіла", якая адбівалася ў рэлігіі, знікла[1], але адначасова не знікае яшчэ само рэлігійнае адбіццё гэтай сілы. Працэс адмірання старога светапогляду спазняецца. Папераджаючы нас аб гэтым, таварыш Сталін кажа, што „свядомасць людзей адстае ў сваім развіцці ад фактычнага іх палажэння. Калгаснікі па палажэнню ўжо не аднаасобнікі, а калектывісты, але свядомасць у іх пакуль яшчэ старая, прыватнаўласніц-

[1] Энгельс, Анти-Дюринг, VI изд., стр. 230.

кая*[1]. Сярод працоўных мас яшчэ існуюць старыя навыкі і прывычкі, традыцыі і забабоны, атрыманыя ў спадчыну ад старога грамадства, існуе яшчэ і рэлігія. Тав. Яраслаўскі настойліва напамінае усім працаўнікам палітычна-асветнага фронта, што значныя групы сялян і частка рабочых выконваюць яшчэ рэлігійныя абрады, такія-ж дзікія, якімі яны былі тысячу год назад[2]. Толькі апартуністы могуць сцвярджаць, што нібы веруючымі асталіся адны старыя, і што цяпер, у выніку бліскучай перамогі соцыялізма, рэлігія быццам адамрэ сама сабой. Між тым існаванне гэтых рэштак старых традыцый і рэлігійных забабонаў з'яўляецца вялікай перашкодай для паспяховай работы па перавыхаванню старых пакаленняў і выхаванню новых у духу соцыялізма. Таму барацьба з гэтымі старымі навыкамі, традыцыямі і забабонамі з'яўляецца адной з першачарговых задач масавай палітычна-асветнай работы.

Калі вам прыходзіцца весці барацьбу супроць рэштак старых традыцый, навыкаў і забабонаў яшчэ нават сярод пэўнай часткі рабочых, то адносна сялянства прыходзіцца ставіць пытанне ў больш шырокім маштабе.

Таварыш Сталін падкрэслівае, што для перыяда дыктатуры пролетарыята Ленін побач з другімі

---

[1] Сталин, Вопросы ленинизма, изд. 10, стр. 508.

[2] Ем. Ярославский, „О религиозных пережитках и задачах антирелигиозной пропаганды и агитации, „Спутник агитатора“, № 16, 1937 г., стр. 27.

задачамі паставіў задачу „перавыхавання асноўных мас сялянства ў духу соцыялізма“ [1] і намеціў канкрэтныя шляхі для яе выраашэння. З ліку старых традыцый і навыкаў сярод сялянства асабліва цэпка трымаюцца рэшткі рэлігійнага светапогляду і рэлігійнай абраднасці. Найбольш свядомы авангард калгаснай вёскі, совецкая вясковая інтэлігенцыя, зразумела, ужо вызвалілася ад рэлігіі; услед за гэтым авангардам адыходзяць ад рэлігіі ўсё большыя слаі калгаснікаў. Але сярод сялянства яшчэ сустракаюцца веруючыя, яшчэ маецца многа хістаючыхся элементаў, падобных да тых, аб якіх вельмі трапна гаварыў таварыш Сталін: „Селянін глядзіць на бога па-гаспадарску, г. зн. селянін часам не супроць-бы адвярнуцца ад бога, але яго часта раздзіраюць сумненні: „а хто яго знае, можа бог і на самай справе існуе; ці не лепш будзе ўблагатварыць і комуніста, і бога, каб больш надзейна было для гаспадаркі“ [2].

І на веруючых, і на хістаючыхся робіцца велізарны націск з боку ворагаў народа, выступаючых пад рэлігійнай маскай. Націск робяць і прафесійныя агенты рэлігіі, і яшчэ недабітыя рэшткі кулацтва і яго прыхвастняў, і агенты і шпіёны фашысцкіх разведак. Таму, на антырэлігійным фронце барацьба ідэалагічная змыкаецца з баявымі палітычнымі і абароннымі задачамі.

---

[1] Сталин, Вопросы ленинизма, изд. 10, стр. 171.

[2] Сталин, Крестьянский вопрос, ГИЗ, 1925, стр. 29—30.

Вось чаму ў наш час антырэлігійная работа ў БССР, як і ва ўсіх астатніх рэспубліках Саюза, павінна быць разгорнута самым энергічным чынам і весціся такімі метадамі, якія здольны даць найлепшыя вынікі. Таварыш Сталін падкрэслівае, што ў адносінах да антырэлігійнай прапаганды сярод сялянства неабходна ўжываць такія метады, якія грунтуюцца на чулым падыходзе да сялянства.

Таварыш Сталін указвае памылку некаторых таварышоў, якія „разглядаюць сялян, як філосафаў-матэрыялістаў, лічачы, што дастаткова прачытаць лекцыю па прыродазнаўству, каб пераканаць селяніна ў неіснаванні бога", раіць улічваць асаблівасці сялянскай псіхалогіі і напамінае, што „ў пытаннях антырэлігійнай прапаганды патрабуюцца асцярожныя адносіны нават да забабонаў селяніна"[1]. У сувязі з гэтымі метадычнымі ўказаннямі таварыша Сталіна асаблівую важнасць набывае таксама пытанне аб адпаведным матэрыяле, якім павінны быць узброены працаўнікі Саюза ваяўнічых бязбожнікаў і калгасны антырэлігійны актыў для дасягнення пастаўленых перад імі агітацыйна-прапагандысцкіх мэт.

Велізарную дапамогу антырэлігійным працаўнікам можа аказаць фальклорны матэрыял. Яго каштоўнасць і асаблівая дзейсная сіла заключаюцца

---

[1] Сталин, Крестьянский вопрос, ГИЗ, 1925, стр. 30.

ў тым, што гэты матэрыял створан сярод саміх працоўных мас. Гэта голас саміх працоўных—рабочых і лепшай, найбольш свядомай і актыўнай часткі сялянства. Ён гаворыць на тэмы, самыя блізкія, самыя злобадзённыя для працоўных, гаворыць словамі, вобразамі, стылем, якія адразу даходзяць да масы, адразу пападаюць у цэль. Ён можа лёгка і хутка пашырацца. Даклад або лекцыя выслухоўваецца адзін раз і толькі пэўнай групай слухачоў, сабраўшыхся на лекцыю, а частушка, песня, трапная прыказка, цікавая вобразная казка, апавяданне аб перажытым лёгка ўспрымаюцца шырокімі масамі, перадаюцца з вуснаў у вусны, самі агітуюць і ствараюць новых агітатараў.

Зразумела, што падбіраць фальклорны матэрыял для антырэлігійнай прапаганды трэба з асаблівай увагай. Тут найбольш цяжкім з'яўляецца пытанне аб прыцягненні фальклорных твораў дарэвалюцыйнай эпохі. Па сутнасці справы нават у капіталістычную эпоху не магло быць фальклора, які прынцыпова выступаў-бы супроць рэлігіі, па той простай прычыне, што ў гэтыя часы, як і ў ранейшыя, пануючым светапоглядам сярод працоўных мас, асабліва сялянскіх, быў рэлігійны светапогляд. „Рэлігія ёсць адзін з відаў духоўнага гнёту, які ляжыць скрозь і ўсюды на народных масах, задаўленых вечнай работай на другіх, нуждой і адзіноцтвам... Рэлігія — род духоўнай сівухі, у якой рабы капітала топяць свой

чалавечы вобраз, сваё патрабаванні на колькі-небудзь вартае чалавека жыццё"[1].

І калі П. В. Шэйн, адзін з дарэвалюцыйных збіральнікаў беларускага фальклора, пісаў, што рэлігія, нібыта, „зусім не цікавіць" беларускага селяніна, ён груба памыляўся, прыняўшы фармальныя адносіны беларускага сялянства да афіцыйнай праваслаўнай рэлігіі за адносіны да рэлігіі наогул[2]. Сялянства царскай Расіі ва ўсім сваім жыцці і быту апіралася на рэлігію і рэлігійныя магічныя абрады. Але стрыжнёвымі элементамі сялянскай рэлігіі на Беларусі былі элементы не афіцыйнага праваслаўя ці каталіцызма, а элементы, якія з'яўляліся спадчынай „дагістарычнага зместа рэлігіі"[3], тыя першабытныя вераванні і абрады, якія ўзніклі на глебе бяссілля дзікуна ў барацьбе з прыродай. Як кажа Ленін, сяляне царскай Расіі былі абрабаваны памешчыкамі і „новым вампірам — капіталам" настолькі, што пухлі з голаду, хварэлі і паміралі ў мучэннях. Удзелам сялянства былі „сярэдневяковыя галадоўкі", бо „абрабаваныя памешчыкамі, задаўленыя праізволам чыноўнікаў, апутаныя сецямі паліцэйскіх забаронаў, прыдзірак і гвалтаў, звязаныя навейшай аховай стражнікаў,

---

[1] Ленин, т. VIII, стр. 419.

[2] Шейн П. В., Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края, т. III, стр. 13, 86 и 371.

[3] Энгельс, Письма Маркса—Энгельса, изд. Адоратским, изд. 2, стр. 311.

папоў, земскіх начальнікаў, сяляне так-жа безабаронны супроць стыхійных бедстваў і супроць капітала, як дзікуны Афрыкі"[1]. Пры такіх умовах, асабліва цяжкіх на Беларусі, якую царскі ўрад эксплаатаваў каланіяльнымі метадамі, сялянства павінна было адносіцца і адносілася да папоў і афіцыйнай рэлігіі фармальна, а часам варожа, і апіралася галоўным чынам на сваю традыцыйную веру і абраднасць, толькі злёгку прыкрашаную хрысціянскім налётам.

Ленін кажа, што „рабы капітала", якімі былі рабочыя і сяляне царскай Расіі, маглі вызваліцца ад рэлігійнага дурмана тады толькі, калі яны ўсведамлялі сваё рабства і падымаліся на барацьбу за сваё вызваленне. У першую чаргу гэта рабіў рабочы, „выхаваны буйнай фабрычнай прамысловасцю, асветлены гарадскім жыццём". Прамысловы рабочы „адкідае ад сябе з пагардай рэлігійныя забабоны, прадастаўляе неба ў распараджэнне папоў і буржуазных ханжэй, заваёўваючы сабе лепшае жыццё тут на зямлі"[2]. Але сярод сялянства маглі вызваліцца ад рэлігійнага дурмана толькі адзінкі, якія на горкім вопыце ўпэўніліся, што „з аднаго дрэва і крыж і лапата", і што „маліся, хоць ты лоб расквась, усё роўна".

Свой шлях да такіх бязбожных настрояў гэтыя адзінкі пачыналі сумесна з асноўнай масай працоўнага сялянства, але ў той час як апошняя

[1] Ленин, т. XV, стр. 415—416.
[2] Ленин, т. VIII, стр. 419—420.

спыняласся на пэўным этапе крытыкі рэлігіі, найбольш свядомыя прадстаўнікі працоўнага сялянства даходзілі да лагічнага вывада — адмаўлення рэлігіі наогул.

Крытыка рэлігіі сярод працоўнага сялянства пачыналася ў неадрыўнай сувязі з класавай барацьбой яго супроць памешчыцкай і капіталістычнай эксплаатацыі. Ленін падкрэслівае, што ў капіталістычных краінах корні рэлігіі — галоўным чынам сацыяльныя; гаворачы больш дакладна, „страх перад сляпой сілай капітала... якая пагражае прынесці яму (працоўнаму.—*Н. Н.*) і прыносіць „раптоўнае“, „нечаканае“, „выпадковае“ разарэнне, гібель,ператварэнне ў жабрака, у паўпера, у прастытутку, галодную смерць—вось той корань сучаснай рэлігіі, які перш за ўсё і больш за ўсё павінен мець на ўвазе матэрыяліст“[1]. У адносінах да сялянства царскай Расіі „сляпая сіла капітала“ была ўдвая згубнай таму, што рускі капіталізм, які толькі пачаў развівацца, рабіў сваю „работу“ на вёсцы „ўласцівым яму шляхам гвалту і прыгнечання, руйнавання і галоднай смерці“ рука об руку з „прыгоннікамі-паследышамі“, „якія, апіраючыся не на „ўладу грошай“, а на традыцыі ранейшай улады рабаўласніцтва, высасваюць цяпер апошнія сокі з патрыярхальнага сялянства“[2]. Бяссільны страх перад сляпой сілай капітала ў першыя часы яго развіцця жывіў і падтрымліваў рэ-

[1] Ленин, т. XIV, стр. 71.

[2] Ленин, т. V, стр. 121.

лігійныя настрої, асабліва веру ў загробнае жыццё. Гэты момант улічвалі і выкарыстоўвалі ў сваіх інтарэсах эксплаататары. Яны і іх агенты, сельскія папы, гэтыя, па выражэнню Леніна, „ураднікі казённага праваслаўя"[1], адчувалі сябе спакойнымі, пакуль сяляне „верылі і знаходзілі сілу цярпець у спадзяванні на загробную ўзнагароду"[2]. Так зусім адкравенна выказваліся сельскія папы.

Але спакойнаму жыццю папоў і іх гаспадароў усё-ж такі прышоў канец. У 90-х гадах сярод сялянства паяўляліся ўжо рэволюцыйныя элементы, наяўнасці якіх, як кажа Ленін, ніхто не мог адмаўляць, і адначасова побач з адкрытым паўстанцкім рухам пачаліся выступленні палітычнага пратэста пад рэлігійнай абалочкай, іменна ў форме „роста ў сялянскім асяроддзі сектанцтва і рацыяналізма"[3]. У 1905 г. сельскія папы ўжо з жахам вымушаны былі прызнацца, што „сёння гэтай веры (у загробную ўзнагароду.—*Н. Н.*) ужо няма. Сёння там (на вёсцы.—*Н. Н.*) вера такая: мы—парабацілі, яны—парабашчоныя..."[4]. Тыя-ж папы канстатавалі, што рост класавай свядомасці сялянства на працягу разгортвання класавай барацьбы і

[1] Ленин, т. XII, стр. 176.

[2] Ленин, т. XVI, стр. 311.

[3] Ленин, т. II, стр. 520 (1899 г. Ленін тут мае на ўвазе пэўныя формы сектанцтва дарэволюцыйнай Расіі. Сучаснае сектанцтва цалкам з'яўляецца контррэволюцыйнай агентурай фашысцкіх дзяржаў).

[4] Ленин, т. XVI, стр. 311.

уздым як на рэволюцыйную ступень, прывёўшы да крытыкі рэлігіі, да пачатку працэса вызвалення ад улады рэлігійнага дурмана, адбываўся пад непасрэдным уплывам новых агітатараў, пранікшых на вёску з горада[1]. Гэта ў першую чаргу былі рэволюцыйныя рабочыя, „рускі пролетарыят, які паказаў сваю сілу, сваё ўменне змагацца да канца, сваю смеласць, сваю рэволюцыйнасць яшчэ ў 1905 г.“. Як кажа тав. Сталін, гэта была „тая новая сіла, якая ні перад чым не астановіцца, ні ў вёсцы, ні ў горадзе, якая пойдзе смела ў першыя рады на барацьбу з царом і памешчыкам, якая дапаможа сялянству вырваца з кабалы, з беззямелля, з гнёту...“ [2]. Рабочыя агітатары прынеслі на вёску новае слова, пастараліся адкрыць сялянству вочы, вызваліць іх ад пелены. Рабочыя-агітатары прынеслі на вёску і свае антырэлігійныя фальклорныя творы, якія ўзмацнілі тыя пачаткі крытыкі рэлігіі, якія нарадзіліся сярод найбольш свядомай, пераважна бядняцкай, часткі сялянства.

Пачатак працэса вызвалення ад улады рэлігійнага дурмана вельмі ярка адбіваецца ў дарэволюцыйным беларускім фальклоры. І раней, у эпоху прыгонніцтва, папы і ксяндзы былі для беларускіх сялян прадстаўнікамі афіцыйнай рэлігіі, агентамі класавых і нацыянальных прыгнятальнікаў,

[1] *Ле. ин, т.* XIX, *стр.* 348—349.

[2] Сталин, Крестьянский вопрос, ГИЗ, 1925 г., стр. 9—10.

такімі-ж пастаўшчыкамі рэлігійнай сівухі, як паны—пастаўшчыкамі простай сівухі: „Дзе поп царкву ставіць, там пан карчму ладзіць".

Пасля рэформы 1861 г. ва ўмовах памешчыцка-капіталістычнай эксплаатацыі да царскай своры катаў, стражнікаў і земскіх начальнікаў, далучыліся і папы. Пасля сялянскіх паўстанняў 60-х гг. царскі рэжым у мэтах барацьбы з рэвалюцыйнымі настроямі сярод беларускага сялянства рабіў, між іншым, стаўку на рэлігійную зброю. Было разгорнута ўзмоцненае царкоўнае будаўніцтва, утрыманне вясковых папоў было прынята на дзяржаўны кошт, вельмі значная частка папоў прысылалася на Беларусь з цэнтральных губерняў. Папы старанна выконвалі соцыяльны заказ, які быў дан ім памешчыкамі і капіталістамі і які Ленін азначае ў наступных выражэннях: „Усе і ўсякія прыгнятаючыя класы маюць патрэбу для аховы свайго панавання ў двух соцыяльных функцыях: у функцыі ката і ў функцыі папа. Кат павінен падаўляць пратэст і абурэнне прыгнечаных, поп павінен рысаваць ім перспектывы (гэта асабліва зручна рабіць без парукі за „ажыццявімасць" такіх перспектыў...) змякчэння бедстваў і афяр пры захаванні класавага панавання, а тым самым прымірыць іх з гэтым панаваннем, адваджваць іх ад рэвалюцыйных дзеянняў, падрываць іх рэвалюцыйны настрой, разбураць іх рэвалюцыйную рашучасць"[1].

---

[1] Ленин, т. XVIII, стр. 259.

Беларускія сяляне хутка раскусілі сапраўдную роль папоў афіцыйнай рэлігіі. Поп, як прадстаўнік і агент царскай улады і эксплаататараў і як непасрэдны эксплаататар, які корміцца з людскіх бед і грабіць беднякоў, зрабіўся канчаткова прадметам сялянскай нянавісці і пагарды. Сяляне заклеймілі папоў прыказкай: „Поп, цар і кат адзін аднаму родны брат". З той-жа нянавісцю сяляне адносіліся і да ксяндзоў, якія былі агентамі польскіх памешчыкаў, уладаўшых на Беларусі велізарнымі латыфундыямі і ўжываўшых прыгонніцкія метады эксплаатацыі. Сялянства трапна падмеціла ўсе адмоўныя рысы папоўскай і ксяндзоўскай ліцамернай маралі і ілжывасці, невуцтва, папоўскага і ксяндзоўскага распуцтва і ганебнага быту. Як верны агент класавых ворагаў і носьбіт сацыяльнага зла, поп у пэўных колах сялянства ўяўляўся прадстаўніком міфічнага хрысціянскага віноўніка зла, чорта, „адной шэрсці" з чортам, які, быццам, неадлучна ходзіць за папом, „нібы цень".

У фальклорнай творчасці агідныя фігуры папа і ксяндза заклеймены з усёй трапнасцю і ўсёй нянавісцю, на якую толькі быў здолен гнеў і творчы геній беларускага народа. Лепшыя казкі, сказы, прыказкі і загадкі, выкрываючыя сапраўдны твар папоў і ксяндзоў дарэвалюцыйнай эпохі, мы даем у гэтым зборніку.

Ад крытыкі папоў і ксяндзоў народная думка, натуральна, пераходзіла да крытыкі іх рэлігіі. Як

мы ўжо ўказвалі, адносіны сялянства да афіцыйнай хрысціянскай рэлігіі заўсёды былі фармальныя. Селянін не мог ігнараваць рэлігію, паколькі без папа або ксяндза чалавек не мог ні радзіцца, ні ажаніцца, ні памерці, ні быць пахаваным. Але ў гаспадарчым і сямейным быту беларускі селянін больш за ўсё спадзяваўся на традыцыйныя, рэлігійна-магічныя сродкі, не давяраючы ні хрысціянскаму богу, ні святым. Яшчэ ў прыказках феадальна-прыгонніцкай эпохі сустракаецца думка, што бог не можа вырātаваць селяніна ад яго старых спадарожнікаў на шляху жыцця—Гора і Ліха. Яны заўсёды і ўсюды побач з чалавекам: „Еду ціха—са мной Ліха, еду скора—са мной Гора", гора ўсюды знойдзе сваю ахвяру, а таму „богу маліся, ды й чорта не гняві"[1]. У капіталістычную эпоху ранейшыя сумненні ператвараюцца ў адкрытую крытыку бога і святых афіцыйнай рэлігіі. „Бог жыве сабе на небе, і не думае аб хлебе",—гаворыць прыказка. Бог уяўляўся, як крыўдлівы, злы, жорсткі і самадурны начальнік; ён, як гаворыцца ў казцы, асудзіў усіх жанчын на вечную несупынную працу толькі за тое, што адна жанчына паказала яму дарогу не рукой, а нагой, бо карміла

[1] Ляцкий, Материалы для изучения языка и творчества белоруссов. Чтения ОИДР, 1898 г., т. III, № 345 и 124; апошняя прыказка запісана таксама Шэйнам і Насовічам. Пад „чортам" тут разумеецца не хрысціянскі чорт, а „забаронены" хрысціянствам прадстаўнікі дахрысціянскага анімізма.

малое дзіця і не магла ўстаць. Больш таго, богі раўнялі з простым машэннікам: „І бог ашукансі вам жыве, у аднаго адбярэ, а другому дасць". Свае ашуканства бог робіць з яўным ухілам на карысць эксплаататараў: „За тым і бог, хто бедака перамог".

Святыя таксама „сядзяць рукі злажыўшы", а „спецыялісты" па землеробству Ілья, Пятро і Паўла ды Юры толькі шкодзяць або помсцяць, а не дапамагаюць. Богі і святыя, якім служаць папы, гэта—богі і святыя багатых ліхадзеяў і ворагі беднякоў; па сваім уласцівасцям яны ўяўляліся дакладным адлюстраваннем зямных начальнікаў і эксплаататараў.

Як відаць з прыказак, у якіх галоўным чынам знайшла сваё выражэнне гэтая лінія крытыкі рэлігіі, яна зарадзілася і была найбольш распаўсюджана сярод бядняцкай часткі сялянства; апошняя была таксама і асноўным рэзервам рэвалюцыйных элементаў сялянства. Па сутнасці справы гэта лінія крытыкі рэлігіі яшчэ не была антырэлігійнай. Яна не адмаўляла рэлігіі наогул, яна адмаўляла толькі афіцыйную рэлігію. Аднак, побач з гэтай лініяй зарадзілася другая, з рацыяналістычным адценнем. Рацыяналістычная лінія ўскрываецца ў радзе прыказак і казак, выкрываючых недарэчны і ашуканскі характар „цудоўных" сродкаў ад бяды ці хваробы—малітвы, „святой вады", кадзення фіміамам, „цудоўных" каменняў, ікон і т. д. Такія „цудоўныя святыні" фабрыкаваліся папамі

і ксяндзамі пры дапамозе папоў (гл. казку „Цудоўны камень“), а часам і карчмароў (гл. казку „Прошча“), праз слабых на розум („шалапаватых“) і хворых жанчын, або абманутых, або падкупленых ксяндзамі. Гэтыя „сведкі“ „адкрывалі“ новыя „цуды“, і тады папы і ксяндзы стваралі масавы псіхоз і набівалі свае кішэні. „Фабрыкацыя“ была часта настолькі грубай, што нават веруючыя адносіліся да „цудаў“ з некаторай іроніяй (гл. „Цудоўны камень“), а рацыяналісты выкрывалі ашуканства зусім адкрыта (гл. „Прошча“). Рацыяналісты ў прыказках замест зварота да „цудоўных сродкаў“ дапамогі раілі добра працаваць, спадзявацца на сябе, а не на бога.

У зборніку даецца фальклорны матэрыял, які ілюструе гэтыя лініі крытыкі рэлігіі. Галоўным чынам яны выражаны ў прыказках, але знайшлі для сябе адбітак таксама ў казках, легендах, анекдотах і сказах.

Наяўнасць значнай колькасці фальклорных твораў такога крытычнага зместа сведчыць аб тым, што вышэйпаказаныя лініі крытыкі мелі шырокае распаўсюджанне сярод працоўнага сялянства. Наадварот, маецца вельмі мала фальклорных твораў, якія сведчаць аб наяўнасці сапраўдных бязбожнікаў, даводзіўшых крытыку да канца і вызваліўшыхся зусім ад рэлігійнага дурмана. У зборніку даецца некалькі сказаў, дзе бязбожнікі з народа апавядаюць, якім чынам яны перасталі верыць у бога. Зразумела, гэта, за ад-

ным выключэннем, усё сказы рабочых,—як і трэба было чакаць.

Такім чынам, антырэлігійнік знойдзе ў фальклорных творах дарэвалюцыйнай эпохі вельмі яркі матэрыял для характарыстыкі сутнасці рэлігіі, як зброі эксплаататараў і непасрэднай эксплаатацыі і як зброі самаашуканства саміх працоўных, задаўленых галечай і духоўным гнётам. Антырэлігійнік знойдзе тут і такі матэрыял, які дасць яму найлепшы падыход да агітацыі супроць рэлігіі сярод веруючых. Словамі саміх працоўных, тых свядомых рабочых і сялян, якія самастойна прайшлі шлях вызвалення ад рэлігійнага дурмана, антырэлігійнік ускрые недарэчнасць і ашуканства рэлігійных вераванняў і абрадаў.

Зусім інакш абстаіць справа з фальклорным матэрыялам савецкай эпохі. Гэта ўжо сапраўды антырэлігійны матэрыял.

Творцы гэтага фальклора—антырэлігійныя сялянскія актывісты, баявыя атрады якіх множацца з кожным годам. Іх парадзіла Вялікая Сацыялістычная рэвалюцыя, тое грамадскае дзеянне, якое, згодна вядомым словам Энгельса, павінна адбыцца ўслед за пазнаннем, каб вызваліць грамадства і ўсіх яго членаў ад таго рабства, у якім яны знаходзяцца пры капіталізме. Дзякуючы гэтаму дзеянню, у нашым Савецкім Саюзе знікла „апошняя знешняя сіла, якая да гэтага часу адбіваецца ў рэлігіі“, і ўслед за тым знікае і „само

рэлігійнае адбіццё па той простай прычыне, што тады ўжо нечага будзе адбіваць"[1].

У нашым новым соцыялістычным грамадстве будуецца новая соцыялістычная культура, і бязбожны светапогляд з'яўляецца адным з яе краевугольных камняў. Таму лепшай адзнакай хуткіх і буйных поспехаў будаўніцтва новай культуры з'яўляецца іменна той факт, што бязбожжа ўжо заваявала сабе трывалыя пазіцыі на вёсцы. Гэтыя пазіцыі процістаяць разбітым рэшткам былых бастыёнаў рэлігіі і яе правадыроў. Апошнія сховішчы рэлігіі яшчэ трымаюцца, і адтуль ворагі савецкага народа і Савецкай краіны часам прабуюць рабіць вылазкі і дыверсіі. Але супроць такіх поўных злобнай роспачы спроб выступае антырэлігійны актыў новага, соцыялістычнага грамадства. Ён выкрывае і дапамагае савецкай уладзе ліквідаваць ворагаў народа, хаваючыхся пад рэлігійнай маскай; ён сваім прыкладам і сваёй прапагандай адцягвае ад рэлігійных забабонаў чэсных грамадзян, якія яшчэ не здолелі вызваліцца ад рэлігійнай атруты.

Сярод калгаснага антырэлігійнага актыва на працягу барацьбы і ў неадрыўнай сувязі з барацьбой за соцыялістычную вытворчасць, соцыялістычны быт і соцыялістычны светапогляд ствараўся і ствараецца кожны дзень моцны і высокамастацкі антырэлігійны фальклор. Адначасова з тым

[1] Энгельс, Анти-Дюринг, изд. VI, стр. 230.

і характара гэтага новага фальклора трэба адзначыць, што ён у сваёй аснове асабліва добра прыстасоўваецца да ажыццяўлення асноўных дырэктыў партыі аб антырэлігійнай прапагандзе на пёсцы, якія патрабуюць барацьбы не з веруючымі, а з рэлігіяй і з рэакцыйным духавенствам. Ліквідацыя рэакцыйнага духавенства, згодна слоў таварыша Сталіна, павінна быць даведзена да канца[1]; але барацьба з рэлігіяй павінна весціся не метадамі адміністравання, забаронаў і здзекаў, а метадамі прыклада, асветы, пераканання[2]. Совецкі антырэлігійны фальклор гэтым і адрозніваецца ад тых нібы „антырэлігійных" частушак, у якіх свядома праводзіцца зневажанне пачуццяў і думак веруючых і якія па сутнасці справы толькі шкодзяць антырэлігійнай прапагандзе. Сапраўдны антырэлігійны фальклор у совецкім, марксісцкім сэнсе набывае свой адначасова і асветны і рэвалюцыйны характар не штучна, а даецца самім жыццём. Пераможная барацьба за соцыялізм, за калгаснае будаўніцтва, за абарону нашай любімай квітнеючай радзімы, за новы быт, за новы светапогляд, барацьба, якую вядзе пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна совецкі народ, на кожным кроку і кожны дзень па-

[1] Сталин, Вопросы ленинизма, изд. 10, стр. 192, 193.
[2] Гл. аб правільных метадах антырэлігійнай работы сярод працоўных у артыкулах Ем. Яраслаўскага, „Антирелигиозник", 1937 г. № 11, стр. 1—11; 1938 г., № 2, стр. 3—6, і артыкул Ф. Олешчука, „Антирелигиозник", 1937 г., № 10, стр. 6—15.

казвае, што рэшткі рэлігіі і агенты рэлігіі— гэта тормаз на шляху социялістычнага будаўніцтва; больш таго—гэта апошняя надзея, апошняя стаўка контррэволюцыянераў і агентаў фашысцкіх дзяржаў. І таму змест твораў антырэлігійнага фальклора неадрыўна звязваецца з матывамі барацьбы за соцыялістычнае будаўніцтва, за абарону краіны, за перамогу соцыялізма ва ўсім свеце.

Творы антырэлігійнага совецкага фальклора не толькі абвяшчаюць новы безрэлігійны светапогляд, не толькі клічуць на барацьбу супроць „бога". Яны адначасова з'яўляюцца баявым заклікам да барацьбы за канчатковае знішчэнне ўсіх контррэволюцыйных сіл, якія, прыкрываючыся імем „бога", выконваюць крывавыя заданні фашысцкіх дзяржаў, падрыхтоўваючых вайну супроць СССР. Адсюль зразумела, чаму найбольш распаўсюджанай формай антырэлігійнага фальклора з'яўляецца частушка; але ён прадстаўлен таксама і ўсімі іншымі жанрамі.

Антырэлігійны совецкі фальклор насычан баявым палітычным зместам, і таму ён мае велізарную агітацыйную каштоўнасць для совецкага антырэлігійніка. Апошняму найбольш зручна пачынаць сваю агітацыю з фальклорнага матэрыяла, пашыраць яго, садзейнічаць яго росту. Падрыхтоўку для належнага разгортвання антырэлігійнай прапаганды лепш за ўсё праводзіць на базе фальклорнага матэрыяла.

На глебе, падрыхтаванай пры дапамозе фальклорнага матэрыяла, антырэлігійная прапаганда здолее хутчэй і лепш пашырацца і паглыбляцца, уздымацца на вышэйшыя ступені—лекцыі і даклады, гурткавыя заняткі, антырэлігійныя вечарынкі і вечары мастацкай самадзейнасці.

Складальнікі зборніка добра разумеюць цяжкасць той задачы, якая перад імі стаяла, і думаюць, што на практыцы выявяцца недахопы, прабелы і памылкі, дапушчаныя пры складанні зборніка. Мы зварочваемся да ўсіх таварышоў, якія будуць карыстацца зборнікам, з просьбай прысылаць свае заўвагі, прапановы і іншыя паведамленні адносна зборніка ў Секцыю этнаграфіі і фальклора Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.

*Акад. Н. М. НІКОЛЬСКІ.*

# КАЗКІ
# і АНЕКДОТЫ

## БОГ, БАБА І МУЖЫК

Жала баба на полі з дзіцёнкам. А тады дзіцёнак закрычаў, дык яна лягла дый корміць яго груддзю і сама есць. А ідзець бог па дарозе і пытаецца: „Баба, пакажы мне дарогу, туды і туды". Яна ўзяла ды нагой і паказвае: „Вунь", кажа яна.—„Ды не, ты-ж устань і пакажы добра".— „А, мне некалі".—„Ну, будзець-жа табе некалі да веку, пакуль ты жыва будзеш, што ты мне дарогу не паказала".

Пашоў бог далей. Прыходзіць к мужыку. Ён косіць.—„Пакажы мне, чалавек, дарогу туды і туды". Кінуў чалавек касіць і павёў бога. Прывёў яго к дарозе, вынуў табак, сам нюхаець, бога частуець. Бог тады гаворыць яму: „Ну, прыдзеш-жа ты, чалавеча, дамоў, дык табе будзець час, слабода. А бабе ні разу".

Дык вось мужык і цяпер: прыдзе дамоў, паабедае і аддыхне час якой. А бабам усё некалі. (1)

## ЯК ПОП ПАРАБКАЎ КАРМІЎ

Жыў-быў поп. Ён быў вельмі зайздросны. Усё капіў багацце. Меў у сябе многа быдла і птушак. У святкі ён многа збіраў з сялян падаяння. Па калядзе, калі ездзіць, то кожны павінен даць яму пару калбас і рэшата аўса. А на пасху, пасвянціўшы сявалкі, браў у кожнага краюшку белага, краюшку чорнага хлеба і пару яец. А гэтымі кра-юшкамі карміў быдла і птушак. У яго былі два работнікі, каторых ён запугваў грахамі, што ад бацюшкі многа трэбаваць нельга, бо гэтага бог не просціць.

Адзін раз на свята матушка пытаецца ў бацюшкі: „Бацюшка, з чым сёння работнікам суп варыць?“ Поп падумаў і сказаў: „А будзем сабе яечкі варыць, ну і звары іх у супе“. Матушка так і зрабіла. У абед поп і пытаецца ў работнікаў: „Ну як, сёння жырны суп?“ „Да не, бацюшка, зусім посны“. „Да як посны, у ім матушка варыла дзесяць яец, павінен быць жырны“.

Так карміў поп сваіх работнікаў. (²)

## ПАПОЎСКІ ПОЛУДЗЕНЬ

Поп з работнікам грэблі сена. Прынеслі ім абедаць: папу бутэльку малака, а работніку бутэльку вады.

Паабедалі яны і пайшлі зноў грэсці. Поп-жа грабець сена ў капу, а работнік грабець у ваду.

— Што ты гэта робіш? Куды ты грабеш?—пытаецца поп.

— А, бацюшка, ты грабеш сваёй кароўцы, а я сваёй. ([8])

## ПОП І РАБОТНІК

Жыў-быў у адной вёсцы поп. І вось аднойчы прышоў да яго прасіцца на работу малады хлапец. Прыняў поп гэтага хлапца на работу і павёў паказваць яму, што ён будзе рабіць. Завёў яго поп у кладоўку, а там у яго было многа сала, калбас. І кажа поп: „Гэта-ж мы будзем есці, а ніхто іншы".

Узрадаваўся хлапец: „Вось гэта дык будзе жыццё",—думае ён. Астаўся ён працаваць у папа, а работа ў яго была—дроў нанасіць, жывёлу даглядаць, ваду цягаць. Адным словам, цяжка працаваў чалавек.

А поп тым часам загадаў кухарцы зварыць снеданне—наварыць бульбы і поліўкі для парабка.

Прышоў час хлапцу для абеду, але бачыць ён, што замест сала і калбасы далі яму поснай бульбы і поліўкі. „Што-ж гэта за ліха,—думае ён,—замест сала і калбасы вунь што". Але рашыў пачакаць і пашоў працаваць далей. Прышоў ён вячэраць, а яму зноў-жа далі той поліўкі і бульбы. І так кармілі яго і на трэці і на чацверты дзень,

І рашыў парабак адпомсціць папу.

Паехаў поп кудысьці, а парабку загадаў добра працаваць. Вось хлапец узяў мяшкі, напхаў іх сенам і падвесіў на бэльцы высока ў хлеве, каб не магла жывёла дастаць. Жывёла хоча есці, бачыць сена, а дастаць не можа.

Прыехаў поп і пашоў глядзець жывёлу. Увашоў у хлеў і здзівіўся: жывёла раве галодная, а сена вісіць на бэльцы. Раззлаваўся поп, паклікаў парабка і гаворыць: „Што-ж ты жывёлу голадам морыш?"

А той хлапец быў кемлівы, дый кажа папу: „Ты ж, бацюшка, таксама мяне карміць добра абяцаўся, а цяпер голадам морыш. Паказаў сала, і на гэтым усё стала". І пабачыў тады поп, што яго парабак праўчыў.

І больш да папа ніхто працаваць не пашоў. (4)

## „ДОБРЫ“ ПОП

Жыў-быў поп. Наняў сабе работніка, прывёў яго дамоў.

— Ну, работнік, служы добра, я цябе не пакіну.

Пажыў работнік з тыдзень, настаў сенакос.

— Ну,—гаворыць поп,—пойдзем заўтра касіць сена.

— Добра, бацюшка.

Дачакаліся яны раніцы, усталі рана. Поп і гаворыць пападдзі:

— Давай-ка нам, матка, снедаць, мы пойдзем на поле касіць сена.

Пападдзя сабрала на стол. Селі яны ўдвох і паснедалі. Поп гаворыць работніку:

— Давай мы і паабедаем за адзін раз, і будзем касіць да самага поўдніка.

— Як вам угодна, бацюшка, можна і паабедаць.

— Падавай, матка, на стол абедаць,—загадаў поп жонцы.

Яна падала ім і абедаць. Яны па лыжцы, па другой хлябнулі—і сыты.

— Давай за адным сталом і папалуднуем, і будзем касіць да самай вячэры.

— Як вам угодна, бацюшка, палуднаваць—дак палуднаваць.

Пападдзя падала на стол і поўднік. Яны зноў хлябнулі па лыжцы, другой—і сыты.

— Давай заадно і павячэраем і заначуем на полі—заўтра раней на работу паспеем,—гаворыць поп работніку.

— Давай, бацюшка.

Пападдзя падала ім вячэраць, яны хлябнулі раздва і ўсталі з-за стала.

Работнік схапіў свой армяк і збіраецца вон.

— Куды ты?—запытвае поп.

- Як куды? Самі вы, бацюшка, ведаеце, што пасля вячэры трэба спаць класціся.

Пашоў на сенавал і праспаў да света.

З тае пары перастаў поп частаваць работніка за адзін раз снеданнем, абедам, поўднікам і вячэрай. (5)

## ПАРАБКОЎСКІ ХЛЕБ

Малады хлапец-парабак не меў сваёй дамоўкі, а ўсё парабкаваў. Але дзе ён не астанецца, усюды яму нядобра, і ідзе ён далей шукаць лепшага прытулку. Наняўся ён у двары служыць пану. Думае сабе, што дзе-ж лепш служыць як не ў пана. Пан багаты, усяго ў яго многа. Служыць ён пану верна, шчыра працуе, а пан усё частуе яго кожны дзень: „Гультай, псякрэў! Няма-ж на цябе лазы!" Ведама-ж, праўду кажуць людзі, што ў пана ласка па парог. Пан дурны, работы не знае, ды толькі панукае.

Кінуў той парабак пана і пашоў шукаць лепшай гаспадаркі. Доўга ён цягаўся без дзела да й пашоў да людзей распытваць, ці не трэба каму парабка. „Вось ідзі хіба-ж к папу, кажуць людзі, бо ў папа якое дзела. Паблагатаў, паблагатаў да й спажывай, што люд даў". Пашоў той парабак дый наняўся к папу. Але, ведама поп, быў ён вельмі скупы ды завідны. Бачыць ён, што людзі завіхаюцца, стараюцца сабе больш зрабіць і што ў іх усяго многа, вось і хочацца яму, каб парабак зрабіў больш. Стараўся, стараўся парабак, а папу

ўсё мала; застаўляе ён яго, каб уставаў да света, як запяе певень ды забрэша сабака, ды каб ішоў у гумно малаціць. „Людзі, кажа, усё памалацілі, а ў нас стаіць. Гультай ты, а не парабак". Горка парабку. Ён стараецца, пнецца з усіх сіл, а папу не ўгодзіш. „Людзі памалацілі, гаворыць ён сам сабе, бо не было чаго малаціць. Якая там лава, як градка, а ў папа напоўпалетка. Налядаваў поўнае гумно, што і да каляд не змалаціць". Але ўстае парабак досвітка, пне жылы ды малоціць. Нарэшце надаела яму дарам рабіць папу ды яшчэ ўставаць так рана, і давай ён прыслухоўвацца, як гэта певень пяе так рана і чаму з ім не адзываюцца другія пеўні. Пацікавіўся ён, аж гэта пяе сам поп: запяе ён пеўнем ды раскатурхае сабаку, пачне яго біць ды скавытаць нібыта воўк. Сабака і забрэша. На другі дзень парабак укінуў сабаку ў пусты калодзец дый спіць сабе, пакуль тонейка прышло, а пеўня не слухае. Пеў, пеў поп, аж яму горла апухла, не ўстае парабак; шукаў ён шукаў сабаку,—няма. Поп плюнуў ды пашоў спаць. Назаўтра давай лаяцца ды сварыцца на парабка. А той кажа, што ніхто яго не пабудзіў, таму ён і заспаўся. Бачыць поп, што з такім парабкам піва не зварыш, і хоча ён, каб не плаціць, а каб парабак ці загінуў, ці сам пакінуў службу. А ў папа было пяць вельмі вялізных ды драпежных вепрукоў. Загадвае ён парабку закалоць аднаго вепрука на калбасы. Думае поп, што як парабак пачне калоць аднаго вепрука, то другія кінуцца

бараніць яго дый разарвуць парабка. „Што тут рабіць, думае парабак, нельга калоць аднаго вепрука". Ён папрасіў дзяцюкоў ды разам і закалолі ўсіх вепрукоў. Пасварыўся поп, але нічога не парадзіш, трэба рабіць калбасы ды ўжываць, бо сала і мяса сапсуецца...

Спужаўся поп, заплаціў парабку, абы ён ішоў сабе куды захоча. (6)

## ПАПОЎСКАЯ ПРОБА

У аднаго папа парабкі малацілі жыта, дык поп усё з іх смяяўся, што злёгку прыбіваюць. Калі яны адыходзілі палуднаваць, поп і кажа сам да сябе: „Улезу я пад пасад, дый пакажу ім, што я вытрымаю іх малацьбу". Ажно адзін парабак астаўся, дый усё гэта падслухаў. Ну, так папалуднаваўшы, як ішлі да гумна, так ён і сказаў парабкам, што поп пад пасадам. Як яны гэта ўзяліся за цапы, так ён маргнуў на іх, дый кажа:

— Зразу, хлопцы, памаленьку, бо патомімся.

Яны гэта як дадуць жару, а поп калі стане скавытаць нелюдскім голасам, так яны, быццам папалохаўшыся, яшчэ добра па разу далі, дый адскочылі на бок, ажно глядзяць, поп вылазіць з-пад пасады. Вось табе і папрабаваў. (7)

## ПОП-ХАБАРНІК

Жыў у нашай вёсцы шавец, бедны чалавек, ды к таму яшчэ ад свайго ґоркага жыцця і выпіваў калі-нікалі. Пахварэў ён крыху ды і памёр.

Трэба пахаваць чалавека. Паклікалі папа з суседняга сяла. Прыгледзеўся ён, што чалавек бедны, нічога з яго не возьмеш, і гаворыць ён да людзей: „А што мне дасцё?“ Людзі да яго і так і сяк: „Мы вас адвязём і прывязём“. Ну, нарэшце, згадзіўся ён. Пахавалі чалавека, а поп усё прыглядваецца, ці не можна ад пакойніка што ўцягнуць. Людзі гавораць: „Гляньце, бацюшка, быў ён бядняк, асталося шылля ды капылля[1] толькі“.

Ажно дзіву людзі даліся. Узяў поп у торбу гэтае шылля ды капылля і паехаў. І ні сораму яму ніякага. Так і прыказка кажа: „Поп і з жывога, і з мёртвага дзярэ“. (⁸)

---

[1] Капыл—шавецкая калодка.

## БЕЗ ГРОШАЙ ТО Й ЗБАВЕННЯ НЯМА

Аднаго разу ксёндз з амбона запытаў людзей:

— Без чаго чалавек не можа быць збавёным?

І прасіў каб адказалі. Падумалі людзі і гавораць:

— Без грошай.

Так ксёндз:

— А чаму-ж то так без грошай?

— А таму,—кажуць,—што як не дасі ксяндзу два злоты, то не ахрысціць дзіцяці, не дай рубля—не дасць шлюбу, а не дай поўрубля,—то не пахавае.

От чалавек без гэтага не можа быць збавёны. (9)

## ЯК ПОП МАЛІЎСЯ

— Панамар, панамар! Узыйдзі-тка на званіцу, паглядзі-тка, ці не ідзець к нам хто, не нясець нам што?

— Віжу, бацюшка, ідзець якаясь баба, нясець на паніхіду стопку бліноў і чарачку мёду.

— Подай, госпадзі!

— Дзякан, дзякан, годзе табе вякаць, узлезь на званіцу, падзівісь, ці не ідзець хто, ці не нясець нам што?

— Віжу, бацюшка, ідзець мужычок і нясець дубінку на папову спінку!

— Табе, госпадзі! (10)

## „СВЯТАЯ“. КНІЖКА

У Гарбацэвічах быў фэст, з'ехалася папоў больш як дзесяць. Тут-жа побач ля царквы прадавалі кніжкі святыя—за 25· капеек, 50 капеек і за рубель. Хто купіць кнігу за 25 капеек, таму меней грахоў адпусціцца; за 50 капеек—ужо грахоў палову будзе адпушчана, а хто купіць за адзін рубель—таму сто процантаў грахоў адпушчана будзе.

Людзі кніжкі купляюць, шукаюць сабе збаўлення ад грахоў.

Адзін поп, што кніжкамі гандляваў, прадаў свой тавар і едзе дамоў. А адзін хлапчына за ім услед вышаў дый кажа: „Давай грошы!“

Поп і кажа: „Што ты робіш? Гэта-ж грэх!“

А той хлапец дастае кніжку за адзін рубель і кажа:

— А во, бачыў,—кніжку маю за рубель,—па ёй усе грахі зямныя прошчаны.

Забраў грошы і ўсё. (11)

## „СВЯНЦОНАЯ“ ВАДЗІЦА

Захварэла ў вёсцы баба ды паслала ўнука свайго ў сяло да папа, каб поп даў ёй святой вады. Паслала яму курачку і яечак, а гэта было якраз вясной, а ў нас вясной Копцеў равок перайсці ніяк немагчыма. Што рабіць? Як вярнуцца з пустой бутэлькай назад да бабы?—Хлопец апусціў бутэльку ў ваду, набраў вады з раўчака і сказаў:

Вадзіца, вадзіца,
Будзь памачніца.

Курачка і яечкі асталіся ў гаспадарцы. Прынёс бутэльку вады і сказаў бабе: „Поп сказаў памачыць вадой грудзі і трошкі з бутэлькі выпіць“. Памачыла баба грудзі, напілася і ад радасці павесялела. Але вада дык з балота разліўнога была.

Балотная вада тое-ж, што і „свянцоная“. Адна карысць. (12)

## ХІТРЫ ПОП

Ідзе поп дарогаю. А быў якраз пост вялікі. Поп узяў калбасу дый грызець, як галодны. Убачыў гэта селянін. Дзіўна яму: ён галадае і ў пост, і ў свята, а чаму-ж гэта поп паста не глядзіць. Вось ён і пытаецца папа:

— Што-та вы, бацюшка, у піліпаўку скаромнае ясцё? Ці не грэх гэта?

А поп і кажа:

— Цёмны, дурны ты, мужык, дрэнна законы божыя ведаеш,—у дарозе папу паста няма. ([18])

## ХІТРЫКІ КСЯНДЗА

Бачыць ксёндз, што парафіяне нешта мала да касцёлу ходзяць і на „божае цяла“ грошы не нясуць. Вось і дадумаўся ён хітрыкі над людзьмі зладзіць.

Умовіўся ён з закрыстыянам[1]) цуд зрабіць. Узялі чалавека праходжага, гарэлкай напаілі і паставілі ў куце пад крыжам і абяцалі за тое, што стаяць будзе ціха і не зварушыцца, яшчэ пляшку гарэлкі.

А закрыстыян на вёсцы людзям кажа збірацца на казанне, бо ксёндз сёння пра грахі людскія гаварыць будзе.

Ідуць людзі ў касцёл і бачаць—стаіць, як святы ў куце, чалавек і венчык на галаве і рукі ўзняты ўгору.

Дзіўна людзям, а ксёндз тым часам і кажа: „Вось, людзі божыя, прышоў да нас святы Антоні—цяжка яму пра вас добрае казаць, адцураліся вы ад богавай сям'і і няма вам паратунку“. Кажа так ксёндз, а сам усё на Антонія паглядае.

---

[1]) Закрыстыян—служка ў касцёле.

А, ведама, улетку ў касцёле дзверы адчынены, дык шмялі і круцяцца ля чалавека. Жартачкі табе,—не ўстаіш тут не зварухнуўшыся,—апанавалі яны „Антонéго“.

Цярпеў бедны „Антоні“, а тады, забыўшыся на сваю богаву службу і гарэлку, палез з амбону.

Ксёндз убачыў гэта, але, ведама, хітры, выкруціўся, ды і кажа: „Вось, людзі, пабачце, не хоча слухаць святы пра грахі вашы. Адышоў ад нас святы Антоні“.

Хітры ксёндз, але людзі хутка даведаліся пра гэты цуд і ксяндзоўскае махлярства. (14)

## КАРАСЬ

Памерла ў адной вёсцы жанчына ў пост. Сталі спраўляць памінкі. Рашылі купіць рыбы. Кінуліся сюды, туды, а рыбы няма. Што рабіць? Закалолі парася, паставілі на стол, запрасілі папа на вячэру. Прышоў поп і давай яны прасіць літасці, што не посная страва. А поп сам рад у пост свежанінкі з'есці. Ён рукой махнуў, падышоў да парася ды кажа: „Ператвары, гасподзь, парася ў карася" А потым звярнуўся да іх і кажа: „Ешце на здароўе. Карась добры". І сам прыняўся есці. (15)

## СКУПЫ ПОП

Жыў поп. Ён быў вельмі скупы. У яго было сала, мяса, калбасы, сыр, масла. Усё гэта ён трымаў у цэркві, бо баяўся, каб у двары не паелі яго работнікі. Адзін работнік дагадаўся і папрасіў старасту, каб той запёр яго ў царкве на час які, а пасля выпусціў.

Уэлез ён на званіцу і схаваўся там. Як толькі скончылася абедня, ён пачаў есці. І паеў усяго, і ў мех наклаў. А потым узяў ды Міколу вусны вымазаў малаком, Пятру—салам, каля Паўла паклаў мяса кусок. Усіх надзяліў. Прышоў стараста, набралі яны там чаго хацелі і пайшлі.

Праз некаторы час прыходзіць у царкву поп. Бачыць, што яго дабро пакрадзена. Калі ён паглядзіць — а ў Міколы вусны ў малацэ. І стаў яго лаяць: „Ах ты сякі-такі! Стары, а ласун". Падышоў к Пятру-Паўлу, а там сала і мяса. Ён іх лаяў, лаяў: „Ну, няхай жа Мікола паеў, а вы і паелі і з сабою яшчэ забралі".

І прынёс усё ў двор. (16)

## ЗАВІДНЫ ПОП

У аднаго вельмі беднага чалавека памерла дзіця... Горка яму, слёзы так і цякуць, бы з бярэзіны сок...

Узяў бедны чалавек рыдлёўку і пайшоў на могілкі, але перш зайшоў к папу і просіць, каб ён пахаваў дзіця.

— Добра, — кажа поп, — толькі ты мне перш прынясі дзесяць злотых і поўасмінкі аўса.

— Няма,—кажа,—бацюшка, у мяне ні аўса, ні грошай. І давай прасіць, каб поп пахаваў дзіця так, а што ён ужо потым адробіць. Куды там! Поп не хоча і слухаць. Як не прасіў бедны, поп стаіць на сваім да і толькі. Заплакаў бедны з жалю і пашоў капаць магілу. Вось капае ён ды капае і выкапаў гаршчок з грашыма: чырвонцы аж ззяюць! Панёс гэта бедны чалавек гаршчок з грашыма дахаты і схаваў яго пад печ, а адзін чырвонец прыносіць папу. Здзівіўся поп, адкуль гэта ў беднага золата, і давай выпытваць. Бедны ўсё і расказаў, як было. Пахавалі ў беднага чалавека дзіця. Сама пападдзя з папом потым зайшлі ў хату к беднаму на памінкі. Позна разышліся ўсе. Астаўся бедны чалавек адзін з жонкаю.

Прышоў гэта поп дамоў, і хочацца яму адабраць ад беднага грошы. Зарэзаў гэта ён казла, абвярнуўся ў казліную скуру, прыладзіў рогі да і пайшоў у самую цемразь к беднаму пад вакно. Прышоў, высунуў у вакно галавішчу з рагамі і кажа нямым голасам: „Аддай мае грошы". Спалохаўся бедны чалавек і аддаў гаршчок з грашыма. Ухапіў поп аберучкі гаршчок і пабег дамоў. Прыбег, хоча паставіць гаршчок на стол, ды не можа, рукі прырасл... Папрабавала пападдзя садраць з папа казліную скуру. Куды там! І скура, і рогі прырасл. Што ні рабіў завідны поп, нічога не ўрадзіць. Прышлося прасіць беднага чалавека, каб ён забраў свае грошы. Сабраліся людзі, дзівяцца на папа, а ён толькі казлінаю барадою трасе. Вось прышоў бедны чалавек, і як узяў свае грошы, дык і скура звалілася, ды не толькі казліная, але і свая. Вось які быў завідны поп. ([17])

## ПРА ПАПА І ДЗЯКА

Быў сабе ў адным сяле поп і дзяк; абодва п'яніцы...

Хочацца ім піць, ды няма за што. Вось дзяк і кажа папу:

— Ёсць у цябе, бацюшка, кніга тоўстая, ты будзеш па гэтай кнізе гадаць, а я пайду красці, нам і будзе з чаго выпіваць.

— А куды-ж ты, дзячэ, — гаворыць поп, — пойдзеш красці?

— А ў нашага Апанаса ў сяле валы добрыя, я пайду, вала ўкраду, у лес павяду ды к бярэзіне і прывяжу. Тады ён к табе і прыбяжыць, бацька, пытацца, а я прыстаўлю хлапца пільнаваць, каб і ад нас хто не ўкраў.

Як сказаў дзяк, так і зрабіў. Вось прыходзіць Апанас, ды плюсь бацьку ў руку.

— А чаго ты, свет, прышоў да мяне?

— Гэта я, бацюшка, сказаць вам пра сваё няшчасце. Вала ў мяне ўкралі.

— А што ты, свет, дасі? Я выворажу твайго вала, у мяне кніга такая ёсць, я як прачытаю, дык і ўзгадаю.

— Каб то ды праўда была, бацюшка, я, што захацелі-б, вам даў.

— Я-ж табе сказаў, што вычытаю. Дасі пяць рублёў ды гарнец гарэлкі, дык і вол будзе табе.

— Да я, бацюшка, не буду і спрачацца за гэтым; зараз пайду і прынясу.

— Прынясі-ж перш гарнец гарэлкі, а пяць рублёў пасля, як вала вычытаю.

Вось мужык і паплёўся па гарэлку. Прынёс ґарнец. Поп і дзяк селі ды й п'юць. П'юць, ды й у кнігу поп глядзіць, ды й кажа мужыку:

— Вось, ведаеш, Апанас, я ўжо выгадаў, дзе вол. Вось ідзі ты ў лес каля нашай палянкі, там і вол твой прывязаны к бярэзіне; ужо яго хочуць весці, ды баяцца, што дзень.

А дзяк хлопцу сказаў яшчэ ўперад:

— Калі хто будзе ісці па вала, ты ўцякай.

Мужык пайшоў, куды бацька казаў, і знайшоў свайго вала. Знайшоўшы, прышоў к папу падзякаваў яму і пяць рублёў алдаў.

Поп і дзяк, узяўшы грошы, давай папіваць. Як грошай няма, а выпіць трэба, дзяк і пойдзе на промысел: у аднаго авечку ўкрадзе, у другога свінню, дык ідуць і ідуць к папу, ды грошы нясуць, а поп усё вычытвае. Так яны пражывалі, ды гарэлку папівалі, пакуль іх людзі не злавілі і не прагналі. ([18])

## ЯК ЧАЛАВЕКУ Ў ДЗЕСЯЦЬ РАЗ ВЯРНУЛАСЯ

Аднаго разу поп за пропаведзю сказаў людзям, которыя былі ў царкве:

— Хто дасць мне карову, таму бог вясной назад зверне дзесяць.

Пачуў гэта адзін селянін, прышоў дахаты і гаворыць жонцы:

— Вось што, жонка. Сёння нам бацюшка гаварыў, калі хто дасць папу карову зараз, то вясной бог у дзесяць разоў болей зверне. Ёсць у нас карова апошняя, давай завядзем яе. А можа будзе ад бога праўда.

Згадзілася жонка аддаць апошнюю кароўку. На другі дзень, ледзь золак заняўся, прыводзяць яны карову на папоў двор і гавораць:

— Вазьмі, вось, бацюшка, толькі малі бога, каб даў вясной у дзесяць раз болей.

Заіскрыліся вочы ў папа ад жаднасці—ну, думае, удалося мне адурачыць іх. Узяў поп карову сялянскую і далучыў яе да сваіх, а селяніну абяцаў богу маліцца шчыра.

Вясною выпусцілі кароў на пашу. Стала хутка жарка і авадні пачалі кусаць кароў. Тыя пабеглі

ў кусты, а селяніна карова па прывычцы пабегла да свайго дому, а за ёю пабеглі яшчэ дзевяць папоўскіх кароў.

Селянін убачыў гэта, вельмі ўзрадаваўся, зачыніў іх у хлеў, а сам пашоў хваліцца суседзям.

Дачуўся пра гэта поп і пайшоў да селяніна, каб аддаў ягоных кароў. А селянін яму і гаворыць:

— Ты-ж, бацюшка, гаварыў: „Калі мне хто аддасць карову, то таму бог па вясне верне ў дзесяць раз болей". Не век-жа гараваць. (19)

## ЖАБРАК І КУЛАК

Жыў кулак на вёсцы і быў ён такі скнара што каліва не дасць. А богу маліўся штодзень і свячу ў царкве ставіў таўсцей за шуло [1] ў браме. Уся хата ў яго была поўная багацця і сала, і розных там прысмакаў.

Вось зайшоў да яго аднойчы жабрак і просіцца заначаваць.

Пусціў яго кулак нанач, а накарміць дык не. Не ў яго натуры чалавека падарожнага карміць. „Птушкі божыя самі кормяцца",—так разважаў кулак.

Лёг бедны чалавек, пояс падперазаў тужэй, ляжыць і глядзіць на розныя торбачкі, што на сценах развешаны. Глядзеў, глядзеў, а тады і пытаецца ў таго кулака:

„Што гэта ў цябе на сцяне вісіць, на покуце?"— „Спі, спі,—кажа на яго кулак,—гэта бог вісіць. Што табе, недавярку, да яго,—ты вось лёг спаць нават не ўкленчыўшы; што ты зразумееш, калі я табе пра бога скажу. Бог валацугам не спагадае".

---

[1] Шуло—слуп.

Заснуў той жабрак, спіць, і сніцца яму, што накармілі яго смачна і ўсяго ў яго ўдосталь.

Вось раніцой ён устаў, бачыць, што кулак спіць, ды і памацаў, што вісіць на покуце ў торбе. Глянуў, ажно там сала копчанае. Паціханьку ўзяў ён тую торбу ды і пасоўваецца ісці.

Кулак прачнуўся, глядзіць ды і праз сон пытае: „Ты што, пашоў ужо, чалавеча?" А сам думае: „Вось добры падарожнік, і карміць яго не трэба",—і кажа яму: „Ну ідзі, ідзі, братка, з богам, хай ён цябе ў дарозе падтрымае".

А той жабрак развітаўся, ды і кажа: „Ну я і пайшоў з богам".

Прачнуўся пазней той кулак, аж бачыць, што сала яго паехала. ([20])

## У ЧЫМ КСЯНДЗУ ВЫГАДА?

*(Казанне ксяндза)*

Шаноўныя парафіяне, скажу вам казанне[1]. Вось слухайце і вушы настаўляйце. Аўца прыносіць лепшы прыбытак, чым чалавек: як астрыжэш аўцу і напрадзеш воўны ды зробіш сукман—ці не цёпла? Як зарэжаш аўцу, здзярэш скуру і сшыеш кажух, ці не выгода? Вазьмі кусок мяса і спячы на ражне, а чы-ж не смачна? Абдзяры лой і зрабі свячу, запаліўшы вечарам, а чы-ж не відна? А цяпер узяць кішкі і вырабіць на струны, нацягнуць на скрыпку і зайграць, а чы-ж не весела? Такія вось прыбыткі прыносіць аўца, мае шаноўныя хрысціяне. А чалавек як памрэ, тады што,—закапай да зямлі і няма табе ніякага прыбытку. (21)

---

[1] Казанне—пропаведзь.

## ДАНІНА НА ЦАРКВУ

Маркаўцы забыліся аб мядовай даніне скітаўскаму манастыру, і ўспомнілі аб ёй толькі тады калі пабудова царквы ўжо была скончана. Спалохаўшыся, што прыдзецца плаціць папу і па другому пуду тукаўшчыны[1], парашылі не хадзіць у царкву. Поп аблажыў іх мёдаваю данінаю за самапраўе:

— Хто не ходзіць у царкву, плаці тукаўшчыну.

Тады маркаўцы парашылі хадзіць у царкву.

А каб не спазніцца да службы і не заплаціць тукаўшчыны, сталі высылаць дзяцей слухаць звон. Дзеці, пачуўшы звон, хутка ўбягалі ў хату і крычалі:

— Тата, хутчэй ідзі, а то ўжо тое раве, што два пуды мёду бярэ. (22)

---

1 Тукаўшчына—даніна на царкву.

## ПАПОЎСКІЯ ПРОПАВЕДЗІ

Прыехаў адзін поп у вёску. Заказаў ён сялянам у нядзелю на пропаведзь прыходзіць.

Прышоў народ. Вышаў поп з кніжкай, а сам пад градусам—і пытаецца:

— Людзі добрыя, ці ведаеце вы, што ў гэтай кніжцы пішацца?

— Не, айцец духоўны, не ведаем,— кажуць прыхажане.

— Ну так вам і гаварыць няма чаго, калі вы такія дурні,—сказаў поп і пашоў за райскія дзверы і больш не паказваўся.

У другі раз прышлі сяляне ў нядзелю, сабраліся каля царквы і параіліся як адказваць папу.

Увайшлі ў царкаў, вышаў зноў поп з кніжкай і пытаецца:

— Ну, зараз ведаеце, што ў гэтай кніжцы пішацца?

— Ведаем, айцец духоўны,—адказваюць сяляне.

— Дык нашто я буду язык аб зубы біць, калі вы самі ведаеце,— сказаў поп і, павярнуўшыся, пайшоў.

Больш сяляне ў царкаў не хадзілі.

Тым і абыйшлося. (28)

## ЯК ПОП ІМШУ АДПРАЎЛЯЎ

Адзін поп пасылаў дзяка красці. Раз паслаў яго з возам красці аўцу, а сам да царквы пашоў. Але людзі набеглі, набілі дзяка добра колькі ўлезла і забралі каня. Дзяк уцёк, і не аглянуўся як прыбег у цэркаў. Згарнуўся каля парога і стаіць, а поп імшу адпраўляў і неяк яму было запытаць, а цікава, ці многа накраў, так пачаў спяваць на царкоўную ноту:

— Дзячэ, дзячэ, а дзе тваё бе?

А дзяк:

— За бе, то забралі ігага.

А поп:

— Чаму то так?

А дзяк:

— А бо набеглі людзі й не было як.

Ну і такім спосабам разгаварыліся, а людзі думалі, што яны маліліся. Ад той пары поп ужо не пасылаў яго красці. О ўжо годзе! ([24])

## ВЫПАДКОВАЕ КАЗАННЕ

Адзін ксёндз любіў піць гарэлку. Аднаго разу перад імшою ён паслаў закрыстыяна да карчмы, каб яму прынёс гарэлкі ў крэдыт. Закрыстыян пашоў, а карчмар кажа: „Не, я без грошай не дам, бо ксёндз ужо і так многа набраў“—і не даў А той карчмар называўся Давід. Вярнуўся закрыстыян, уваходзіць у касцёл, а ксёндз якраз гаварыў казанне аб цару Давідзе і так кажа да людзей: „І што-ж на гэта адказаў цар Давід“?. А закрыстыян, пачуўшы гэтыя словы, падумаў, што ксёндз у яго пытаецца, ды адказвае: „Давід казаў, што болей гарэлкі без грошай не дасць, бо ксёндз і так даволі вінен“. Тады ксёндз, застыдзіўшыся, кажа: „А ты, кажа, дурню, то не аб гэтым Давідзе ідзе гаворка“. Ды з амбону і на двор, не скончыўшы нават казанне. (25)

## АБ ПАПУ, ШТО КАЛЯД ЗАБЫЎСЯ

У адным месцы пазбіраўся народ на каляды да цэрквы — ждуць-пождуць на папа, а папа няма. Ужо і сонца ў гару падышло—папа няма. Ідуць ужо яны глядзець, што такое з папом сталася. Угледзіў іх поп да й пытае: „А вы чаго, мужыкі, пазбіраліся"?—„Да цэрквы, бацюшка, сёння каляды". А поп: „Дзе,—кажа,—вам сёння каляды?". Давай па пальцах лічыць дні, ды й ні дайшоў толку, і кажа на жонку: „Давай кніжку, недзе ляжыць пад лаваю". Пападдзя кніжку падала з-пад лавы, поп паглядзеў: „Але, праўда, каляды"—да й плясь гэта жонку па спіне кніжкай, што ні напамінула, да й кінуў зноў кніжку назад пад лаву, а сам пайшоў да цэрквы хутчэй подбегам.

Вось і папоўскі лік. (26)

## ПРА ПАПА, ДЗЯКА І ГОЛУБА

Жыў сабе поп з дзяком. У апошнія часы ў іх было мала даходу. Вось і пачаў поп думаць, якбы яму заманіць у царкву больш народу...

Злавіў ён голуба, пафарбаваў яго, нарысаваў на грудзях крыж і пусціў па вёсках чуткі, што ў царкву спусціўся святы дух, які будзе ў ёй да Міколы, а на Міколу раніцою паляціць назад на неба.

Людзі нарыхтавалі ўсяго і прышлі ў царкву яшчэ за дзень да Міколы. Бачыць поп, што выйгрыш будзе, і давай ён голуба карміць, каб шпарчэй ляцеў, ды ачышчаць месца на грошы. А дзяку кажа:

— Ты возьмеш голуба ў кішэню і будзеш стаяць у народзе. А як толькі я скажу: „Святы душа, падыміся",—ты і выпусціш яго.

На Міколу дзяк запхнуў голуба ў кішэню і пайшоў з папом у царкву. Народ хрысціцца, моліцца. Раптам дзяк неяк спаткнуўся і ўдарыўся бокам аб зямлю, ды якраз кішэняй, дзе быў голуб. Той адразу і задушыўся.

Вышаў поп на амбон, памаліўся, перахрысціўся і кажа:

— Святы душа, падыміся!

Дзяк штурхаў, штурхаў голуба, а той ляцець і не думае—ахаладаў ужо зусім. Поп падумаў, што дзяк не пачуў, ды зноў:

— Святы душа, падыміся!

Пачакаў, ды яшчэ раз:

— Святы душа, падыміся!

Дзяк аж раззлаваўся, дый кажа:

— Святы душа задушыўся!—і шпургануў голубам у папа. Поп аж на куртачкі прысеў. А народ падняў такі шум, што хоць вушы затыкай.

З таго часу людзі пакінулі верыць у папоўскія цуды. (27)

## ЯК ПОП КАРТЫ РАССЫПАЎ

Адзін поп дужа любіў гуляць у карты, і так загуляўся адну ноч пад нядзелю, што гуляў да самай утрані. Сторож званіў, званіў, а папа ўсё няма. У царкву ўжо і людзі прышлі маліцца, а папа ўсё няма. Ужо і дзячок прышоў, а папа ўсё няма.

Вось сторож кінуў званіць, ды прышоў к папу ў хату. А той з гасцямі гуляе ў карты і ніяк не хоча адарвацца. Вось сторож пачаў яго прасіць. Поп са зла схапіў карты, ды не паклаў іх у кішэню, а засунуў у рукаў і так прыбег у царкву. Апрануўся ў свае рызы, забыўшыся, што ў рукаве карты.

Адслужыў утрань. А потым вышаў на амбон да людзей і пачаў казанне. Казаў, казаў, ды як размахнецца рукой і як пасыплюцца з рукава карты па царкве. Дзеці і падлеткі давай збіраць тыя карты, ды піхацца, ды біцца. Папужаліся людзі, а папу стала сорамна. Дык ён вось што выдумаў. Падышоў да хлапчука і кажа:

— Ты карту падняў?

Хлопчык кажа:

— Я.

— Пакажы мне яе!

Хлопчык паказаў.

— А ну, скажы мне, як гэтую карту завуць?

Хлопчык кажа:

— Пікавая дама.

— А богу маліцца ты ўмееш?—пытаецца поп.

— Не,—кажа хлопчык.

Вось поп узяў гэтую карту, узышоў на амбон, падняў карту ўверх, ды як закрычыць:

— Сорамна вам, людзі, за такія вашы ўчынкі. Якія-ж вы бацькі, што вашы дзеці такія распусныя. Паднялі ў царкве такую вайну. Я рассыпаў карты наўмысля для таго, каб выведаць вашых дзяцей. Аж гэта не дзеці, а авечкі; такія-ж і вы бацькі, як вашы дзеці. Богу маліцца не ўмеюць, а карты ведаюць. Значыцца, хутка канец свету.

Вось так поп змог адурыць у царкве людзей, яшчэ і накрычаў на іх, ды напужаў канчынай свету. ([28])

## ДЗЯДОЎСКАЯ ХІТРАСЦЬ

Дзяды, што пад касцёлам сядзелі, у бога не верылі; абы ім толькі грошы давай, дык яны пра ўсякае ўздумаюць.

Адзін дзед сеў пад касцёлам, зайграў на ліру ды і спявае (калі людзей няма):

Ой, я граю на леру,
Ой, я ў бога не веру.

Адзін чалавек кажа: „Дзеду, дзеду, пані ідзе“. Тады дзед спявае на святую ноту:

Ой, святы, святы Мікалаю,
Правадзі маю душу да самага раю.

Вось які хітры. ([29])

## ШТО ПАПУ БЫЛО ЗА ЧУЖУЮ ЖОНКУ

Поп хадзіў да жонкі аднаго гаспадара, а яна мужыку сказала. А мужык быў хітры: навалок у каморку дзе якое меў жыта і папастаўляў у мяхах за жоран, дый кажа да жонкі: „Я быццам паеду, а ты яго пакліч сюды, а як надыйду, скажы, каб ён жыта малоў у каморцы". А сам узяў і паехаў.

Поп гэта прыбягае, а тут муж над'язжае. Жонка і шэпча папу: „Ідзі ў каморку і мялі жыта, ён будзе думаць, што сусед, прышоўшы, меле". Той і пабег. Так меле, так меле, а мужык сабе прышоў, лёг спаць, праспаўся, устаў, пасядзеў, і чуе, што пусты камень барабаніць,—гэта поп так круціць. Вось быў у добрым вырабе. ([80])

## КСЁНДЗ, БАБА І МУЖЫК

Ксёндз прыходзіў да жонкі мужыка. А яна, каб мужык не ведаў, прыкінулася хворай, і паслала мужыка к ксяндзу, ці не параіць ён якога зелля. Той пашоў, а ксёндз яму і параіў: „З'ездзі, кажа, на Лысую Горку, набяры пяску ў чужым двары, звары яго, ды той вадой напаі жонку".

Прышоў селянін у двор, запрог каня і хоча ўжо ехаць. Вышаў я к яму і пытаю: „Куды гэта, дзядзька, хочаш ехаць?". „Ды за пяском,—кажа,— на Лысую Горку,—ксёндз параіў". „Слухай ты іх,— кажу.—Ты-ж от толькі не ездзі, дык убачыш, што тут будзе". Ён і паслухаў, узяў выехаў з двара, аб'ехаў навакол, паставіў на агародзе каня, а сам у пуні захаваўся.

Тым часам прыходзіць ксёндз, прыносіць гарэлкі. Хворая накрыла на стол і пашла бяседа. Я й кажу: „Цётка, дай мне торбу, пайду я на траскоўнік назграбаю чаго-небудзь, няхай прасохне к заўтраму".—„А й добра ты кажаш, ідзі ў клеці вазьмі".

Пашоў я, выбраў велізарны мех, ды ў пуню. Пасадзіў мужыка ў мех да й уцягнуў у хату, ды

пад печ і падсунуў, а сам стаў ля печы. А ў іх ужо дым карамыслам. Баба пяе: „Як паехаў мой Ягорка за пяском на горку. Каб пяску ён не набраў, а каб згінуў ды прапаў". А ксёндз сабе нагамі тупае: „Тра-та-та, тра-та-та". А тады мне кажа: „Спей-ка й ты што-небудзь". От я й зачаў: „Ой, ці чуеш ты, Ягорка, што тут жонка гавора? Ой, бяры-тка ты вожкі, да вылазь-ка патрошкі. Ой, бяры-тка разгон, да бі ксяндза наўздагон, жонку раз, ксяндза два, каб ні казаў тра-та-та". Як вылез-жа мой Ягор, ды як пачаў лупцаваць іх: то ксяндза, то жонку, то ксяндза, то жонку. Кінуў ксёндз і гарэлку, і шапку, і рызззя сваё, ды наўцёкі... (31)

## СПОВЕДЗЬ ШЛЯХЦІЦА

Спавядаўся шляхціц перад бернардынам[1] і гаварыў пра тое, пра гэта, аж, нарэшце, кажа: „Цалаваў чужую жонку“,—але ў сваё апраўданне дадае, што не рабіў-бы гэтага, ды людзі яму дарадзілі, што гэта ад хваробы вачэй памагае.

А бернардын на тое кажа: „Не вер, калі-б то праўда была, я ўжо праз сцяну бачыў-бы“. (82)

---

[1] Бернардын—каталіцкі манах.

## ПРОШЧА

У глухім Палессі, за балотам, за такою тхланню, што адтуль і свету божага не відна, была вёска. У той вёсцы была царква старэнькая, скрывіўшаяся. Недалёка ад царквы стаяла карчма, такая старая, аблупленая, без страхі, з загатаю і падпоркамі. Бедны быў там поп, бедны і рандар, бо калі няма даходу папу, то няма і рандару. Але рандар быў вельмі хітры. Тры дні ён сядзеў, не піўшы, не еўшы, усё думаў, як-бы яму разбагацець. Спалохалася жонка, думае, што можа яе муж памяшаўся. Толькі от на трэці дзень рандар пашоў к папу. Позна ён сядзеў у папа, амаль да трэціх пеўняў, усё штось гаварыў папу. Вось прышлёпаў рандар да гасподы, а на другі дзень паехаў у мястэчка.

Прайшла нядзеля, а можа і дзве. Пачалі касіць. Было пагоднае лета. Вось вечаркам у нядзелю сядзяць людзі на прызбах, пад ліпамі каля царкві, сядзяць, гавораць, люлькі кураць. Тут-жа каля самага сяла пры рацэ гуляюць дзеці. Вечар пагодны, цёплы. Пачало цямнець; на небе загарэліся зоркі. Вось бягуць дзеці і крычаць: „Сюды,

сюды, вунь па рацэ плывуць зоркі". Падняліся мужыкі, бачаць, аж праўда: па рацэ штось плыве з вадою і кругом яго як-бы свечачкі гараць. Пабеглі сказаць пра гэта папу. Прышоў поп, паглядзеў і кажа, што гэта цуд. Палез староста на званіцу і давай званіць як на вялікдзень. Высыпала ўсё сяло к рацэ. Пабег поп у царкву, адзеўся ў рызы ды й пашоў з крыжамі к рацэ сустракаць той цуд. Падышлі людзі бліжэй к рацэ, бачаць, ажно плыве старая дошка, а на ёй ляжыць абразок паміж свечачак. Свечачкі гараць роўна, бы ў цэркві. Падплыла дошка к берагу, заблыталася паміж калітак ды й стала. Узяў гэта поп абразок на бераг, паставіў на камені і давай служыць малебен. Усюды загаварылі, што ў тым сяле аб'явіўся цуд, і паваліла адтуль людзі к той прошчы. Нясуць ахвяру, хто што можа. Разжыўся скора поп, але яшчэ больш папа разжыўся рандар, бо, ведама, хто адкуль ні прыходзіць, то ўсё-ж дасць рандару ўтаргаваць. І славіцца тая прошча на ўвесь свет. Але кажуць, што гэты цуд зрабіў рандар, умовіўшыся з папом. Кажуць, што з мястэчка крамар пазнаў, быццам гэта той абразок, што ў яго рандар купіў нібы для папа. ([33])

## КАМЕНЬ „ЦУДОЎНЫ“

Мо‘ ведаеце—каля Вызны ляжыць „цудоўны“ камень. Я яшчэ памятаю, як там быў хмызняк.

Дзе быў лес ды хмызняк каля „цудоўнага“ камня, там пан Пратасевіч узараў поле, пакінуўшы дзве ці тры хвойкі ды бярэзіну. Каб свінні не пашкодзілі, збудавалі там капліччку.

Кожную першую нядзельку туды збіраецца адусюль шмат людзей. Каго-каго толькі там няма! Туды цягнуцца й калекі ды хворыя, туды прыходзяць гаротнікі, якія хочуць пазбавіцца ад бяды ці ліха або напасці, туды ідуць маліцца й такія людзі, каторыя нават самі не ведаюць, чаго ім трэба. Адзін раз мне давялося спаткаць там такую старую бабу, што мабыць ёй больш як сто гадоў.— „А ты чаго прыпаўзла сюды, бабка?“—пытаю я, а яна адказвае, што прышла памаліцца, каб даў бог смерць. „Мабыць у бога шмат клапот і без мяне,—кажа яна,—калі ён забыўся пра мяне і не дае мне смерці“. Мне казалі, што тая бабка ад прошчы насілу прыцягнулася да гасподы, ды як лягла, дык ужо і не ўстала, а на другі дзень і богу душу аддала. Вось і гавораць, што вельмі

добра „памагае" тая прошча, што каля Вызны. А ці ведаеце вы, як яна аб'явілася? Дык от слухайце. Жыла тут у нас адна якаясь шалапаватая[1] жанчына. Пачала яна гаманіць, што як толькі засне, дык к ёй аб'яўляецца боская матка ды й кажа, што прошча там, куды пойдзе чарада авец і дзе яна атаб'ецца сярод дня аддыхаць. Пачала тая шалапаватая аб тым гаварыць, але ніхто не дае ёй веры. Вось, як па зговару, незабаўкі гэтакжа быццам прыснілася і другой жанчыне, каторая ўжо мо' два ці тры гады хварэла на галаву. От і тая жанчына пачала расказваць: „Боская матка,— кажа,—вельмі прасіла, каб там, дзе яна сядзела на камені, ды была прошча".—Як пачулі аб тым нашы людзі, дык акурат у першую нядзельку, як тая шалапаватая пагнала авец, назіркам пашлі за чарадою. Вось авечкі нібы проста й прывялі к таму каменю. Тагды хутка людзі адусюль пацягліся да тае „прошчы". І каб вы бачылі, колькі там збіраецца пану ды ксяндзу грошай ды другога дабра, і на воз не забярэш. (34)

[1] Шалапаватая—слабая на розум.

## ПОП І БАРОМЕТР

Бывае так, што стане табе засуха і няўрод. Людзі ў гэтакі час нямаведама што робяць, каб гэта дождж пашоў, а каторыя дык і да папа ідуць, каб малебен адслужыць. Ведама, што даўней табе і навука не кожнаму дадзена была і зямля наша бядняцкая, як каўтуном,—каменнямі пабіта была.

Прышлі сяляне да папа, каб малебен адслужыў, можа дасць бог дажджу. А поп не прыймае, сёння, кажа ён, хворы. А сонца смаліць і няма паратунку.

Пашлі на другі дзень. Ізноў поп хворы.

Пашлі праз два дні. Тады ён і кажа: „Сёння я магу адслужыць малебен, падрыхтуйце ўсё, што трэба".

Пашлі небаракі[1] з іконамі. Хто што можа цягне; апошняе папу аддаюць, каб хаця дождж з неба пайшоў.

Моліцца поп, вочы ўгару ўставіўшы; аж, на табе, увечары сыпане дождж, як па заказу. „Гэтакая сіла бога,—людзі сабе думалі.—Добра маліся—усё ад яго будзе".

[1] Небаракі—бядныгі.

Але-ж яно ўсякая табе няпраўда наверх выходзіць. Парабак быў у папа такі хлапец хітраваты, ён з пакояў папа ўзяў штуку такую са стрэлкамі, што ў кніжках барометрам называюць, ды ўсім людзям паказаў: „Вось, глядзіце, кажа, заўтра дождж і без паповай малітвы будзе“. Ажно праўда. Сыпануў дождж, як трэба.

Поп пакуль да бога, так раней у механізм гэты заглядваў.

Так і адкрылася папова хітрасць. (35)

# ЛЕГЕНДЫ і СКАЗЫ

## ЛЕНІНСКАЯ ПРАЎДА

Жылі на вёсцы два браты. Поле яны аралі, зямлю слязмі палівалі і гарбы сабе нажывалі. Хлябок і скаціну ў іх паны забіралі, а плацілі за гэта кулакамі ў спіну.

Жылі браты не год і не два, а невядома колькі. Навокал і другія мужыкі таксама жылі.

Абрыдла братам рабіць на чужое здароўе. Рашылі яны адправіцца па Расіі-матушцы праўды шукаць.

Ідуць яны месяц, ідуць год. Бачаць—стаіць вялікае сяло. Пасярэдзіне—панскі дом і царква каменная.

— Дай,—думаюць браты,—зойдзем сюды і папытаем праўды.

Ідуць яны па вёсцы, а насустрач ім пан у калясцы едзе.

— Чые вы, мужычкі, адкуль ідзеце і чаго шукаеце?—запытаў іх пан.

Браты адказваюць яму:

— Жылі мы, жылі ў жабрацтве, у горы, больш сілы не хапіла так жыць. Ідзем праўды шукаць. Навучы нас, пане, дзе яе знайсці.

— Добра,—кажа пан,—пакажу я вам праўду, калі пажадаеце, толькі вы мне папрацуйце за гэта.

Згадзіліся браты.

Працавалі яны, працавалі: поле аралі, зямлю слязмі палівалі. Прашоў год. Прыходзяць яны да пана і гавораць:

— Навучы цяпер, пане, як нам праўду знайсці.

— Ну, вось вам і праўда,—адказвае ім пан,—голь нямытая, працаваць вам заўсёды на нас, паноў.

Плюнулі браты і пашлі далей. Ідуць яны месяц, ідуць год. Бачаць, стаіць поп.

— Навучы, айцец, дзе праўду знайсці?—пытаюць яны.

— Добра,—кажа ён,—я вам праўду ў цара нябеснага вымалю, а вы ў мяне папрацуйце за гэта.

Згадзіліся браты. Працавалі яны, працавалі, зямлю слязмі палівалі. Прашоў год. Прышлі браты да папа, а ён ім кажа:

— Працуйце вы добра і не гнявіце бога—вось і ваша праўда.

Плюнулі браты і пашлі далей. Прыходзяць яны да купца. Вышаў ён—тоўсты і багацей за пана і папа.

— Добра,—кажа купец,—навучу я вас праўдзе, толькі папрацуйце на мяне.

Згадзіліся браты. Пачалі браты працаваць і гарбы нажываць. Вучыў іх купец, як чэсны народ

ашукваць і беднату абмервáць. Не дачакаліся і году, як малодшы брат і кажа:

— Не пайду я больш праўды шукаць, няма яе на свеце, праўды мужыцкай.

І вярнуўся ён у сваю вёску. А старшы брат настойлівы,—не хацеў ён без праўды дамоў варочацца. Пашоў ён адзін да фабрыканта.

Фабрыкант і за пана, і за папа, і за купца багацей. Пачаў старшы брат працаваць у яго. А на фабрыцы многа людзей працуе.

Працавалі яны многа год. Гарбы нажывалі, а праўды не бачылі. Толькі раз пачуў брат на змене ціхую гутарку:

— Ёсць чалавек адзін—ён і праўду ведае. Завуць гэтага чалавека Леніным, а жыве ён на поўначы, у Піцеры.

Запомніў брат імя гэта і пашоў шукаць гэтага чалавека.

Ішоў многа дзён, а можа быць і месяцаў. Прышоў у Піцер. Бачыць, ідзе рабочы. Ён яго запытаў ціханька:

— Дзе тут Леніна знайсці?

А той яму яшчэ цішэй:

— Пойдзем са мной, я цябе давяду.

Вось і прышлі яны ў звычайны пакой. Кругом розных кніг многа. Вышаў да іх чалавек, апрануты небагата, але чыста. Ён і кажа:

— Добры дзень, таварышы, што скажаце добрага?

Расказаў яму брат, як ён праўду шукаў. Доўга

а ім гаварыў Ленін, аб парадках на фабрыцы распытваў, аб вясковай беднаце, а потым сказаў:

— Правільна ты зрабіў: на фабрыцы праўду ты лепш пазнаеш. Вы яе там у руках трымаеце.

І расказаў Ленін брату, як трэба за рабочую праўду змагацца, каб не служыць ні панам, ні купцам, ні фабрыкантам, і як выгнаць іх разам з царом.

Вярнуўся брат зноў на фабрыку і пачаў другім ленінскую праўду тайнымі словамі расказваць. Адзін расказвае, а дзесяць слухаюць, дзесяць расказваюць, сто слухаюць. І пашла ленінская праўда па ўсяму свету.

Многа год хадзіла яна па фабрыках і вёсках. Узнімала яна рабочых і сялян на барацьбу. А ў Кастрычніку 1917 года абвясцілася гэта праўда зычным голасам, залпамі на ўвесь свет. Пашлі рабочыя і сяляне бязлітасанай вайной на памешчыкаў і фабрыкантаў. А вёў іх тады сам Ленін са сваім лепшым памочнікам Сталіным. І ўзяла верх у Кастрычніку ленінская праўда.

З таго часу рабочыя і сяляне больш не працуюць на паноў і фабрыкантаў, гарбоў не нажываюць, зямлю слязмі не паліваюць, самі гаспадары сваіх фабрык, сваёй зямлі і свайго жыцця. (1)

## ЯК МУЖЫК-БЯДНЯК І РАБОЧЫ ДАБІЛІСЯ СВАЁЙ ПРАЎДЫ

Жыў-быў мужык-бабыль, здаровы, працавіты мужчына, здольны да ўсякай работы. Сухія жорсткія мазалі ніколі не сходзілі з яго закаравелых рук. Але колькі ён ні біўся, колькі ні матаўся, а з нужды-голаду выбіцца не мог. Хата-халупа развалілася, жонка б'ецца без кароўкі, дзеткі плачуць—есці хочуць, а самому хоць лезь у пятлю ці галавою ў прорубку. Няма і не відна ніякага выхаду. Такая мужыцкая доля, што-б век на другіх работаць, мазалі наганяць і самому галадаць.

Вось мужык, падцягнуўшы свой жывот папругай, пашоў дабівацца праўды, як жыць на свеце працоўнаму люду без нужды і голаду.

Прышоў да цара і стаў прасіць яго навесці добры парадак і праўду сярод людзей, што-б усім было добра жыць і работаць. Цар скоса паглядзеў на мужыка, і паслаў яго ў салдаты—і далей, на вайну. Мужык некалькі гадоў пацёрся ў салдатах, пабываў на вайне, палучыў некалькі ран і вярнуўся дамоў, дзе застаў сваю сям'ю ў

горшай нуждзе і голадзе. Мужык пачухаў патыліцу і падумаў: „Дык вось якая царская праўда, якія царскія парадкі!“.

Пашоў мужык шукаць праўды ў пана. Зняў шапку і стаў прасіць прыняць яго на работу, каб пракарміць сябе і падгадаваць сваю сям'ю. Паглядзеў пан з насмешкай на мужыка і паслаў яго батраком на свой фальварак. Праслужыў мужык год батраком на панскім фальварку і патрабаваў плату за сваю работу. Пан паслаў мужыка на канюшню і загадаў сваім слугам даць яму сто лоз гарачых за гадавую работу, а затым канчаткова прагнаў яго з двара. Прышоў мужык дамоў і знайшоў там яшчэ большую нужду і гора, чым было раней, да службы ў пана. Пачухаў мужык патыліцу і падумаў: „Дык вось яна, панская праўда, панская ласка!“.

Пашоў мужык шукаць праўды ў кулака і стаў прасіць яго прыняць на падзённую работу, каб пракарміць сябе і падгадаваць сваю сям'ю. Кулак паглядзеў на бедняка і паставіў яго да сябе на работу з дагаворам плаціць за кожныя тры месяцы акуратна. Бядняк праслужыў падзённікам тры месяцы з гакам і патрабаваў плату за сваю работу, а кулак замест платы паказаў яму дулю і прагнаў яго з двара. Прышоў бядняк-мужык дамоў, паглядзеў на сваю худобу і падумаў: „Дык вось якая праўда ў кулакоў-жывадзёраў!“.

Пашоў мужык шукаць праўды ў папа і стаў прасіць яго параіць, як бедняку выбіцца з нужды

і голаду. Поп ласкава паглядзеў на беднага мужыка і параіў яму заказаць малебен за палепшанне мужыцкага жыцця, з умовай, што мужык за параду і за малебен адработае шэсць дзён за папоўскай гаспадарцы. Мужык хаця-нехаця згадзіўся на заказ малебна і адработаў шэсць дзён на папоўскай гаспадарцы. Ды жыццё мужыка-бедняка ні капелькі не палепшала, наадварот—яшчэ пагоршала. Пачухаў мужык патыліцу і падумаў: „Дык вось яна, папоўская праўда, папоўская малітва!".

Пашоў мужык шукаць праўды па розных пуцях і напрамках. Хадзіў доўга па свету, сустракаўся з рознымі людзьмі, а праўды нідзе не знайшоў. Нарэшце, сустрэў на сваім пуці чалавека праўдзівага, каторы распытаў мужыка-бедняка, дзе ён быў, куды хадзіў і чаго шукаў. Мужык адкравенна расказаў, што хадзіў шукаць праўды ў цара і пана, у кулака і папа, але акрамя здзекаў з мужыка нічога там не знайшоў. Новы папутчык выслухаў мужыка і сказаў яму: „Ты дужы, працавіты мужык, але шукаеш ты праўды там, дзе яе ніколі не было і не можа быць. Калі хочаш дабіцца настаяшчай праўды ды лепшага жыцця,—аб'яднайся з рабочым і сумесна з ім пераламайце рэбры вашым царам і панам, кулакам і папам. Толькі такім пуцём вы сумесна з рабочымі даб'ецеся сваёй праўды і лепшага жыцця для ўсіх працоўных". Субяседнік развітаўся з мужыком, назваўся Леніным і пашоў далей сваёй дарогаю. Мужык падбадрыўся і падумаў: „Дык вось

дзе настаяшчая наша праўда, дык вось якім пуцём трэба дабівацца праўды і лепшага жыцця!".

Пашоў мужык-бядняк за рабочым і сумесна скінулі цара і прагналі паноў, кулакоў-міраедаў, капіталістаў, чыноўнікаў і папоў, устанавілі сваю, совецкую ўладу, а зараз пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна будуюць соцыялізм у сваёй краіне, дзе жыць стала лепш, жыць стала весялей для ўсіх працоўных. (²)

## ЖЫЦЦЁ РАНЕЙ І ЦЯПЕР

Раней жыў поп і кулак, і на іх працаваў батрак. Яны яго эксплаатавалі, а батракі за нікчэмную плату дзень і ноч працавалі. А папы дзень і ноч у званы званілі, і ўсіх, хто не слухаў іх, адам страшылі. Але цяпер прышоў новы час, ліквідавалі кулацтва як клас. Расквітнеў наш совецкі калгас; там былы наш батрак як ударнік працуе, ён Краіну советаў мацуе. Паглядзіце цяпер як жыве наш рабочы: ён на пана, папа, кулака болей плеч не згінае,—ён рабочых сусвету ўсяго на дапамогу СССР заклікае. „Святы папа“ паходам на нас ішоў, але нешта далёка ён не дашоў, бо, відаць, ён пабачыў магутную сілу рабочых, сялян, бо ўзняўся адзінай сцяной на сваю абарону народ-велікан. (⁹)

## „СВЯНЦОНАЕ ЗЕЛЛЕ"

Людзі казалі, што свянцоная вада дапамагае ад ста хвароб, а наш поп надумаўся яе ў бутэлькі разліваць і проста вазіць па сёлах, бо не ў кожнай вёсцы „свянцоны" калодзеж ёсць, бо простым, „несвянцоным" журавом ці вядром з калодзежа гэтай вады не вычарпаеш.

Дастаў ён бутэлек мо' дзюжын дванаццаць, паналіваў гэтай вады і збыт пачаў. Хто ідзе да яго, з пустымі рукамі не прыходзь. Ну, кончыўся гандаль, едзе поп дамоў, бутэлькі хоча сабраць, каб марна не прападалі. Хто згубіў тую бутэльку ці пабіў, дык поп не брэзгаў любой,—ці ад гарэлкі, ці дзенатуркі, ці ад такога спірта даўнейшага, што косці і чэрап намалёваны. Усё браў. А пасля развозіў ізноў гэтае зелле свянцонае, і людзі дзівіліся, што на дне бутэлькі надпіс такі сабе не вельмі святы—„Піць нельга". ([1])

## ЯК ЦАРКВУ БУДАВАЛІ

Як царкву будавалі ў нашым сяле, дык звозіць камені і цэглу ўсіх пасылалі, а плата запісвалася на адпушчэнне грахоў.

Будаваў царкву памешчык. Дзесяцін можа пяць тысяч было. Мастака, што царкву распісваў, прывезлі нейкага замежнага; ён э год сядзеў і усё маляваў.

У гэты час памерла пані, дык пан заказаў, каб у алтары намалявалі яе ў выглядзе божай маці.

Царква тая грошы каштавала нямаведама колькі, а пан, як вайна з белапалякамі была, уцёк разам з імі. Можа і цяпер слухае, ці звоняць званы на царкве,—ажно не, бо мы радыё правялі і клуб зрабілі. (б)

## ЯК Я ПЕРАСТАЎ ВЕРЫЦЬ У БОГА

Калі я быў яшчэ малады, пашоў я раз у царкву. У той час поп якраз гаварыў казанне. Я перахрысціўся, стаў у баку, ды слухаю. Ажно поп і кажа:

— Як жылі Адам і Ева, дык не было ні неба ні зямлі, а рос толькі адзін зялёны дуб.

У царкве стаяў малады хлапец; ён быў вялікі жартаўнік, дык ён і пытае ў папа:

— А на чым-жа той дуб рос, бацюшка, калі не было ні зямлі, ні неба?

Тады ўсе людзі паехалі са смеху. Няшчасны поп убачыў, што з яго смяюцца, сказаў, што яму перашкодзілі гаварыць казанне, пашоў у алтар, а адтуль наўцёкі дамоў падаўся.

З таго часу я больш не хадзіў у царкву і не стаў верыць ні ў бога, ні ў чорта. (6)

## ЯК ДЗЯЦЕЙ ХРЫСЦІЛІ

Ігналёў сын ходзіць скручаны вось праз якую прыгоду. Уздумаў Ігнат хрысціць сына, а гэта было зімой, на санках вёрст дванцаць паехаў да царквы, сына малога ў кажух укуталі і да папа.

Поп у царкве—у купель паклаў, вада што з прорубі,—халодная: дзіця малое і пасінела адразу. Дамоў неяк даехалі, а праз дзень яно малака не бярэ. Ногі, рукі неяк скруціла, так, можа, з год качалася ў ложку, ледзь дзіця адхадзілі, а поўзаць пачаў, дык не як усе дзеці—хадзіць да гадоў трох не мог. З таго часу і калекай астаўся.

Вось якая „карысць“ ад гэтага хрышчэння.

Дзеці нашы жывуць здаровыя і без папоўскага хрышчэння. (7)

## ЯК МЫ ВУЧЫЛІСЯ

*(Сказ старога рабочага)*

Бацька наш памёр, пакінуўшы сям'ю з шасці душ. Працаваў я адзін—грузіў дровы на станцыі, а маці дома ўвівалася каля астатніх пяці маленькіх дзяцей. Ніхто з нас не вучыўся.

Блізка каля нашага дому была царква. Там поп адчыніў школу. Звалі яе васкрэснай, бо займаліся па нядзелям, адзін раз у тыдзень.

Маці аддала мяне ў гэтую школу. Вучылі нас па псалтырах, часасловах; навука была нікуды Вучыў нас усяму гэтаму айцец Якаў—худы і высокі поп, злы як яшчарыца. Калі не вывучыш што-небудзь, дык ён абавязкова лінейкай па плячах праедзецца. Але больш за ўсё ён любіў цягаць за валасы: „Я вам,—кажа,—пакажу зараз гару Арарат",—і цягне за валасы, ажно свет з авечы хвост здаецца.

Хлопцы, вучні нашай школы, дзеці рабочых, былі ціхія і забітыя, і часта заплаканыя ішлі дадому.

Я быў хлопец зухавы, і надумаліся мы з Антонам устроіць папу такую штуку. Зарабляў я ў

двень 30 капеек. Маці аддаў 20, а 10 капеек узяў сабе. Раніцой, як толькі хлопцы ішлі ў школу, я сабраў усіх, хто быў з доўгімі валасамі, і павёў да парыкмахера, які жыў каля царквы. Ён за гэтыя грошы і збрыў валасы пад першы нумар.

Прышлі ў школу. Сядзім, чакаем папа. Уваходзіць. А мы паціху смяемся ў кулак. Пытаецца ён у Янкі: „Вывучыў?“

Той вочы спусціў да зямлі: „Не ведаю,—кажа,— урока“. Бацюшка падышоў, толькі нацэліўся за чупрыну ўзяць, аж яе і няма.

Раззлаваўся ён, ажно глядзіць—усе голеныя. І тут зразумеў у чым справа. Але хітры поп з таго часу пачаў цягаць нас за вушы.

Вось так і вучыліся. (8)

## СЛУЖБА САЛДАЦКАЯ

Навек захавалася ў маёй памяці восень 1913 г., калі мяне прызывалі ў царскую армію. Раніцою абыходзіў поп дамы жыхароў, якія пасылалі на ваенную службу сваіх сыноў, і прымушаў будучых салдат цалаваць крыж, даваў ім настаўленнё служыць „верай і праўдай“ цару-бацюшку.

Многа горкіх слёз пралілі мацеры і жонкі прызваных, многа пракляццяў паслалі яны тым, хто забіраў у іх кармільцаў.

Да нас, маладых салдат, быў прыстаўлен катфельдфебель, які адразу-ж пачаў абучаць нас „славеснасці“, г. зн. уменню велічаць усіх членаў царскай сям'і. Аднойчы фельдфебелю не падабалася картавае вымаўленне тытула цара маім таварышом, і ён ударам кулака разбіў яму твар да крыві.

За чатыры гады службы ў крэпасной артылерыі і мне не раз пападалі зубатычыны ад фельдфебеля. Больш за ўсё мяне білі за ненаведванне царквы.

Апрача наведвання царквы, нас у абавязковым парадку прымушалі чытаць кнігі, якія адцягвалі

салдат ад палітычнага жыцця: „Бог—наш высший судья“, „Почему царь помазанник божий“—Балдырына, „Пришествие ведьм“. Цяжка апісаць усе сродкі і формы, якімі салдат ператвараўся ў бяспраўнага, забітага чалавека...

І цяпер, калі глядзіш на жыццерадасных юнакоў нашай краіны, якія ідуць у слаўную Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію для абароны сваёй бацькаўшчыны, становіцца асабліва радасна на душы.

Малады савецкі патрыёт—баец доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі разам з усім народам стаіць на ахове заваёў соцыялізма, аберагае шчаслівае, светлае жыццё. (9)

## „МОШЧЫ НЯТЛЕННЫЯ“

Пашлі чуткі, што мошчы нятленныя Ефрасінні Полацкай у Віцебск прынясуць. Народу пашло насустрач цьма: тут і калекі розныя і хворыя,— усе ісцалення чакалі. Стражнікі народ разганялі. Пакуль ісцаленне, дык аднаго старага калеку прыціснулі так, што ён і не ачуняў.

Папоў і манахаў розных шла цэлая сотня, за імі народ, а наперадзе ў багатай труне ляжаць мошчы гэтай Ефрасінні. Людзі да долу падаюць перад гэтай святасцю. Ну, паставілі гэтыя мошчы ў галоўным саборы, малебствы былі цэлы дзень, народу перабыло тлум.

Штодзень ішлі людзі пакланяцца тым машчам, ішлі і калекі і хворыя, думалі—можа вымаляць сабе здароўе. Неслі іншых і на насілках. Каля труны скрыні вялікія пастӑўлялі, каб грошы кідалі туды людзі. Каб хто ісцаліўся, дык асабліва не чуваць было, але шуму было досыць—баек многа расказвалі.

Праз вялікае шкло ў труне было відаць, што ляжыць святая Ефрасіння, як жывая, хоць і памерла многа сот год назад. Манахі, што пры

труне стаялі, расказвалі, што ўсё гэта ад святасці гэтай Ефрасінні.

Прышла рэволюцыя. Дачуліся людзі, што многа дзе паадчынялі мошчы і нешта мала святога ў іх знаходзілі.

Сабраліся людзі і патрабавалі, каб адчынілі і ў нас. Веруючыя і папы супярэчылі, але ўсё-ж адчынілі. І тут народ пабачыў абман, бо касцей у труну гэтай Ефрасінні напіхалі і мужчынскіх і жаночых, увесь шкілет быў склееены глінай; нага, што людзі цалавалі, была напіхана ватай, а панчохі, дык зусім новыя з фабрыкі Марозаўскай, тры пары адзеты былі.

Размоў пра „святасць" машчэй Ефрасінні тады было шмат,—папы ад сораму не паказваліся на людзей, а хто верыў у мошчы, дык таму паказана было, чаму ён пакланяўся. ([10])

## ВОРАГІ НАРОДА

Ніколі не забудуць сяляне Лельчыцкага раёна таго страшэннага пакутнага часу. Ніколі не забудуць таго, як ураднік Даройк разам з лельчыцкім папом і ксяндзом здзекваліся з вясковай беднаты.

Было гэта ў 1918—1920 гг., калі Беларусь была акупіравана спачатку нямецкімі войскамі, а пасля белапалякамі. Сялянская моладзь ішла ў лес і арганізоўвалася ў партызанскія атрады.

У часе нямецкай акупацыі поп Бакарэвіч кожны дзень з'яўляўся да нямецкіх афіцэраў і дакладваў аб выяўленых ім савецкі-настроеных сялянах, аб тых сем'ях, моладзь якіх пашла ў чырвоныя партызанскія атрады.

Аднойчы ў вёску Сіманічы прыехаў нямецкі карны атрад і пачаў арыштоўваць сялян. Вывелі на вуліцу бедняка Калістрата Боба і пачалі біць.

— За што?! Што я такое дрэннае зрабіў?— прасіўся Калістрат.

Афіцэр крыкнуў злосна:

— Ведаем што!.. А ў царкве папу аб чым ты расказваў? Ведаем, усё ведаем!

Калістра́т успомніў, што, будучы на споведзі, ён шчыра расказаў папу аб сваёй крыўдзе на здзекі нямецкіх акупантаў.

Пасля ўходу немцаў, за некалькі дзён да прыходу белапалякаў, лельчыцкія поп і ксёндз разам зураднікам Даройкам падрыхтавалі ў Лельчыцах паўстанне супроць Савецкай улады. Гэты загавор быў ліквідаван чырвонымі партызанамі. Але затое, як прышлі белапалякі, поп Бакарэвіч яшчэ больш пачаў выдаваць сялян.

Папы былі агентамі, прамымі дапаможнікамі міжнароднай контррэвалюцыі, якая імкнулася задушыць маладую рэспубліку Саветаў. Гэта добра зразумелі сяляне Лельчыцкага раёна.

Вось чаму яны даўно перасталі ўжо верыць усякай папоўскай хлусні, перасталі верыць у бога. Калгаснікі добра разумеюць, што рэлігія з'яўляецца лютым ворагам нашага соцыялістычнага будаўніцтва. ([11])

## „ВЕРУЮЧЫЯ“ ЗАБОЙЦЫ

З малых год мяне прымушалі верыць у бога. Мой бацька працаваў на чыгунцы кандуктарам, дома ніколі не быў, а маці прымушала нас хадзіць у царкаў і гаварыла, што бог сядзіць на небе і карае ўсіх, хто не ідзе маліцца. Маці казала, што ў бібліі і кнігах святых усё правільна, на карысць чалавеку напісана.

Жылі мы ўпрогаладзь, і свята чакалі толькі таму, што маці на свята наварыць і напячэ ўсяго смачнага.

Паехалі мы ў часе вайны ў Сібір, і тут я пераканаўся, што ні бога, ні святых няма.

У той час у Сібіры дзейнічаў кат Калчак. Я папаў у плен, і мне давялося бачыць, як на плошчы рубілі шашкамі дзяцей чырвонаармейцаў і рабочых, добраахвотнікаў Чырвонай арміі. Поп стаяў і благаслаўляў крыжам. Гэты выпадак канчаткова выбіў з маёй галавы ўсякія думкі аб богу і святых, бо гэтыя байкі выдумалі для абману працоўных. „Веруючыя“ забойцы знішчалі людзей, не гледзячы, што ў бібліях і кнігах „божых“ самі пісалі: „Не забі“. ([11])

## БОГАЎ СЛУГА

Царква ў нашым сяле вялікая, стаяла на ўзгорку, крыжы на купалах і на калакольні былі відаць за вёрст дваццаць.

Поп з царквы ніколі не вылазіў, у яго хаце да раніцы гарэў агонь,—людзі казалі, што ён усё моліцца богу. Усе гаварылі, што вось ён дык сапраўды богаў слуга,—такі справядлівы чалавек не скрыўдзіць і граша не возьме. Як стала рэволюцыя і прышла Совецкая ўлада—поп знік недзе.

Царква стаяла зачыненая, пустая. Парашылі там клуб зрабіць.

Рабочыя пачалі сцэну рабіць. Знялі алтар, і тут-та адкрылася „богава“ натура папа: у алтары знайшлі грошы на тысяч можа пяць царскіх і серабра разменнага. ([13])

## ДОЛЯ МІНУЛАЯ І ЖЫЦЦЁ СУЧАСНАЕ

Доля жанчыны раней была горкая. Не толькі ад пана, а і ад папа залежала.

Ахрысціць дзіця—трэба прасіць папа, каб імя добрае даў, бо калі пад злы нораў патрапіш, дык дасць сыну імя, як нашаму пляменніку даў,—імя Пуплій—так, кажа, па календару вышла.

Успомніце, як было пры цару Нікалаю. Ужо з малых год падкрэслівалася бясправае жанчыны.

Бывала, калі народзіцца хлопчык, поп бярэ яго на рукі і нясе за так званыя „царскія вароты". А калі народзіцца дзяўчынка, поп падносіць яе толькі да „царскіх варот" і кладзе на падлогу, бо яна „недастойна прайсці за царскія вароты".

Калі хто не хацеў ісці да споведзі, поп у царкве стыдзіў і анафему насылаў.

Але так доўга не было.

Царкву мы даўно закрылі, зрабілі з яе добры клуб. Зараз туды ходзяць усе жанчыны, мужчыны, маладыя і старыя, бо перад нашымі вачыма стала новае жыццё—без папоў і бога.

У нашым Саюзе жанчына роўнаправўна. (14)

## БЫЛО ДЫ МІНУЛАСЯ ГОРА

Як я жыў пры цары, пазнаў гора і бяды, на свае семдзесят пяць год меў я многа ўсякіх прыгод. Жыў я пад панскім прыгонам, працаваў на полі да сёмага поту, а дзеці хлеба не елі ўахоту. Палкай пан мяне біў, жонку да вечара на полі трымаў, паратунку ад пана я не знаў. А як падатак збіралі, нас палкамі збівалі. Мы ў бога збавення шукалі, але нешта яго не даждалі.

Над маёю хатай павісла гора,—няма дзеткам хлеба скора; к пану не пойдзеш прасіцца, да яго не прыступіцца. Скінуў я шапку, стаў на калена, але ў пана палка як палена, пан мяне з хаты выкідае, майго гора ён не знае. „Ты, кажа, як пад плотам пажывеш, тады плáту прынясеш". Поп бедаку не спагадае, яму ўсё не хапае, уладыка сам рад дзерці з беднага лыка.

Але даволі нам стала прыгон цярпець, больш панам і папам на нашай шыі ўжо не сядзець. Адышло, мінулася гора, паноў з іх маёнткаў мы паскідалі, самі вольна жыць сталі. Стала вясёлай мая сям'я, дзеці ў школу ідуць, іх навукам там вучаць; падрастуць, іх да працы далучаць. У кал-

Ґасе жыву я заможна, і, не гледзячы на старасць сваю, у калгасе я першы ўдарнік і ўжо не тужу, зарабіў усяго, чаго трэба, не чакаю збавення я з неба. І бацьку нашаму Сталіну прывітанне шлю я, шле вялікае дзякуй мая ўся сям'я. (15)

## СКАЗ СТАРОГА КАЛГАСНІКА

Добрае наша жыццё, і пабудавана яно без усякіх багоў, без усякіх чарцей. А што было раней? Раней мы і ў бога верылі, і хрысціліся, і маліліся яму, а добрага жыцця не бачылі.

Вось раскажу я вам пра сваё жыццё.

Было ў майго бацькі 8 гектараў зямлі, а сям'я свайго хлеба не мела, на старане прыходзілася зарабляць. Калі мне было 12 год—у батракі пайшоў. Шмат з вас бачылі, — ад цямна да цямна я працаваў у кулакоў, атрымліваў за гэта па 10—12 рублёў у год.

І бог не дапамагаў мне ў маім горы. З дзяцінства прывучылі мяне ў бога верыць, маліцца яму, а бог на нас—батракоў ды беднякоў—і не звяртаў увагі.

Калі я ажаніўся і аддзяліўся ад бацькі, на маю долю прышлося $2^1/_2$ гектара зямлі. Нажыў каня храмога ды кароўку захудалую. Колькі не маліўся, колькі не біў свой лоб перад „святой“ багародзіцай і іншымі „святымі“,—лягчэй ад гэтага мне не станавілася. Усё роўна свайго хлеба ніколі не хапала, а пра сала і малако і гаварыць нечага.

Сала ды малако папы елі, і настоў яны ніякіх не прызнавалі. Яны вучылі нас пасціцца для таго, каб сабе кішэні набіваць.

Калі прышла рэволюцыя, папы цвярдзілі нам: усё роўна не жыць большэвікам, бог і гром іх паб'е. А што атрымалася? Зусім іншае. Большэвікі зямлю нам далі і правільнае жыццё павялі. Наша совецкая ўлада і бацька наш родны Сталін калгасы для нас пабудавалі, трактары ды камбайны прыслалі нам, усяк дапамагаюць. Дзевяць год ужо як я ў калгасе жыву і гора не ведаю. Жыву прыпяваючы і яшчэ жыць хочацца. ([16])

## ЯК Я СТАЎ БЯЗБОЖНІКАМ

— Вам дзіва, што я ўстаю з-за стала і не хрышчуся? Гэта цяпер не дзіва. Я ўжо не першы год бязбожнік. А як я ім зрабіўся, я раскажу.

Мае нябожчыкі бацькі былі людзі надта набожныя. Яны з усіх жыл стараліся, каб і мяне зрабіць такім: можа чалавекам будзе, — гаварылі яны. Бывала ў нядзелю, як толькі забразгае маці скавародкамі, усхвацішся кулём з пасцелі і скарэй за конаўку мыцца, а адным вокам .усё на блін пазіраеш.

— Ідзі-ж, станавіся на калені ды гавары пацеры [1], — кажа бацька.

Не хацелася мне маліцца, але нічога зрабіць нельга было. Станавіўся я на калені, і пачыналіся пацеры, доўгія, доўгія, як вяроўка. Бывала, як пачнеш з „господзі Ісусе", ды пакуль даедзеш да „дастойнай", у горле перасохне, а жывот да самай спіны прыцягне. А маці ўжо і дзежку аскрабае.

Тут я ўжо больш не вытрымліваў.

[1] Пацеры—малітвы.

— Не буду больш гаварыць! Згарыць яно няхай з пацерамі! На чорта яны мне!—крычаў я праз плач. Але тут бацька браўся за сваю папружку... Ну і балючая-ж яна была. Каб яе агні! Здаецца, цяпер яшчэ шчыміць.

Тады ў мяне былі два найбольшыя страхі— бацькава папружка ды бог, які заўсёды мог мяне пакараць, ці кінуць у пекла, дзе я буду кіпець па вушы ў смале.

Калі я трохі падрос і пайшоў у школу, бацькаву папружку замяніла настаўнікава лінейка, а бог астаўся такім-жа страшным, як і быў. Бывала, як пачне настаўнік расказваць пра „страшны суд" ды пра „пекла", мурашкі па целе папаўзуць і валасы станудь дыбам.

Вось і вышаў, такім чынам, з мяне хлопец набожны, такі-ж, як і мае бацькі.

Ну, і перадавалі-ж мы ў той час богу нямала ўсякай усячыны. Кожны год не цялё, то парасё, не парасё, то цялё пусцім для царквы, хаця каб бог жывёлу гадаваў, а ў саміх то ўсяго і жывёлы было адна кароўка ды адна свінка.

Самі, бывала, зрэбныя[1] кашулі ды порткі насілі, а кужаль[2] маці ўвесь богу аддавала: то на абраз, як носяць па вёсцы, то на абраз у царкву ці ў капліцу, то проста на „імшу". Маліліся мы шчыра. Бывала, і не пытаючыся, ведаеш, што маці была

[1] Зрэбныя—грубыя палатняныя.
[2] Кужаль—тонкі лён.

ў царкве: гузы на ілбу сядзелі як пірагі—гэтак шчыра яна адбівала паклоны.

Вось гэтак яно вялося да таго часу, пакуль не памёр мой бацька. У якім гэта годзе было, я не памятаю, памятаю толькі, што гэта было неяк хутка па калядах у пятніцу.

Паехаў я па папа. Прыехаў на двор, а ў дом баюся заходзіць, бо я тады лічыў, што поп троха-што роўны з богам.

Увайшоў я ў кухню, бачу: ля печы стаіць нейкая дзяўчына, а ў печы пячэцца калбаса і яшчэ нейкія прысмакі.

— Ці не можна прасіць бацюшку, каб ехаў чалавека пахаваць,—запытаў я. Яна пайшла ў суседні пакой і праз хвіліну вярнулася.

— Бацюшка казаў, каб ты пачакаў. Бачыш, у яго сёння госці. Яны толькі пачалі ў карты гуляць, а таму няма часу,—сказала яна і, узяўшы з услону перапечку, пачала рэзаць яе ў ражку. І трэба-ж здарыцца, каб гэта была якраз тая перапечка, якую я даў папу, калі ён хадзіў па калядзе. Пазнаў я яе па крыжы на верхняй скарынцы, які маці заўсёды рабіла пальцам на перапечках, калі саджала іх у печ.

„Вось яно, чаму богу так многа трэба",—прышла мне ў галаву грэшная думка.

Падумаў я і пра калбасы, якія поп збіраецца есці ў пятніцу, і пра карты, у якія ён у той час гуляў. „А дзе-ж бог? Ці бачыць ён усё гэта?"—запытаў я сам сябе, але тут-жа схамянуўся і тры разы

перахрысціўся, каб адагнаць ад сябе грэшныя думкі.

Прасядзеў я тады чуць не да цямна, ды так і не дачакаўся. Поп вышаў і сказаў мне, каб я сёння ехаў дадому, а прыязджаў заўтра.

Прывёз я на заўтра папа і пахаваў бацьку. Пачаставаўшы папа, запытаў, колькі яму трэба.

— Тры рублі,—адказаў ён.

— Бацюшка! Беднасць... Сіроты раздзетыя засталіся... Можна-б было рубліка,—кажу.

— Грэх таргавацца. Супроць бога ідзеш, бацька-ж на тым свеце гневацца будзе,—адрэзаў мне поп.

Злосць мяне ўзяла і на папа, і на бога. Пазычыў я ў суседа тры рублі і кінуў іх яму на стол.

З таго часу мяне неяк заўсёды нудзіла, калі я слухаў папоўскае казанне.

З'яўляліся розныя думкі і пра бога, але усё-ж такі адрачыся ад яго зусім баяўся. Вазьму ды эгавару калі-небудзь пацеры, хоць не цэлыя, скарочаныя. Няхай, думаю, будзе на ўсякі выпадак, можа і згодзіцца.

Вось так можа-б яно дагэтуль цягнулася, але прыехаў у той час у нашу вёску з горада студэнт—сын аднаго нашага селяніна. Ён ніколі не маліўся і не хрысціўся, не святкаваў свят і не пасціў пастоў. Нашы вясковыя звалі яго нехрысцем і бязбожнікам, і трохі баяліся яго.

Вось і прышла мне ў галаву думка пайсці пагутарыць з ім. Прышоў я ды кажу яму: „Чалавек

вы разумны і з вялікай адукацыяй. Мусіць, кажу, разумнейшы нават за папа, калі і яго не слухаеце; памажыце мне, калі ласка, разабрацца ў маіх думках пра бога, пра чорта і пра папа".

Ён узрадаваўся, пасадзіў мяне і давай тлумачыць. Выклаў ён мне ўсё як на далоні: адкуль і зямля ўзялася, як на ёй розныя жывёліны, а пасля і чалавек з'явіўся, і як людзі сталі выдумліваць розных багоў і кланяцца ім. У мяне нібы заслона спала з вачэй. З таго часу я з богам ужо зусім расквітаўся. ([17])

## ЖЫЦЦЁ БЕЗ БОГА І СВЯТЫХ

**Як жылі мы раней?**

**Раней мы толькі і ведалі, што пакарацца кулаку і папу.**

Яны нас вучылі: „Маліцеся і атрымаеце збаўленне ад усіх грахоў. Рай вам будзе на тым свеце".

За сваё жыццё ранейшае мы не мала гора перажылі і розных недахваткаў мелі: то хлеба няма, то дзеці босыя.

Верылі ў бога, білі ілбы ў царкве ў падлогу, але ўвесь век галадалі. На вузенькай палосцы кожны год быў неўраджай, хлеба свайго хапала ўсяго на тры-чатыры месяцы. Прыходзілася працаваць за кавалак хлеба ў пана і кулака.

Кожнае лета ў нашу вёску прыязджаў поп свяціць невялічкія палоскі „святой" вадой, служыў малебства. Сяляне аддавалі за гэта папу апошнія капейкі, а ўвосень знімалі той-жа самы мізэрны ўраджай.

Прышла рэволюцыя. Старое жыццё знікла. Рэволюцыя змяніла свет і жывем мы без бога і святых, самі гаспадары свайго жыцця. Як кінулі

верыць папоўскім байкам, у калгасе нашым ураджай надзіва, усе ўзяліся за працу—поле наша вокам не акінеш, ураджай багаты ў калгасных свірнах.

Жывём мы без папа, царквы, дзецям нашым не забіваюць галавы рэлігійным дурманам, школы для іх адкрыты і аб усіх клапоціцца мудры бацька ўсіх працоўных—Сталін.

Ворагі наш калгас разваліць думалі, сектанты розныя злыя чуткі пра канец света распускалі, але ніхто не падаўся на іх агітацыю. Тое, што запісана ў Сталінскай Канстытуцыі залатымі літарамі,—запісана навечна. Партыя стварыла нам усе ўмовы для радаснага, культурнага і заможнага жыцця.

Праклятае мінулае ніколі не вернецца. ([18])

# ПЕСНІ

## А Ў ТУРАВЕ ДЫ НА МУРАВЕ...

А ў Тураве, ды на мураве .
Тры дойліды [1] цэркаў стаўлялі.
Тры дойліды цэркаў стаўлялі
Ой, ды на каменным на падмурку,
За ваколіцай, на пагурку,
Каб віднелася ды народу,
Што ў няшчасці жыве ад роду.
Тры дойліды цэркаў стаўлялі,
Слупы цясалі таўстыя,
Ой, ды вокны рубалі бальшыя,
Чырвоным золатам малявалі,
З плашчаніцай іконы прыбіралі.
Гўчныя званы чаплялі,
Каб у цэркаў люд сабіралі.
Люд збірацца ў царкву тую будзе,—
Поп прыбытак сабе там здабудзе. (1)

1 Дойліды—плотнікі.

## ПЕСНЯ ЎДАВЫ

Вось я сяду ды й паеду
К свайму татку на параду,
Раскажу я свайму татку
Пра сваю ліхую долю.

Няхай знае мой радзімы,
Як дачушка пражывае.
— Парай, татка, парай, родны,
Як пражыць мне удавою?

Як пражыць мне з маім горам,
Ды з малымі сіратамі?
Мая-ж хатка разбурона,
Мае-ж дзеткі не ўзрашчоны.

Маё поле не пашона,
Мае лугі не кашоны,
Я-ж, малодка, заматалася,
Пад вокнамі настаялася,
Ўсе парогі паадбівала,
Дапамогі не дастала.

— Ой ты, роднае дзіцятка,
Памагчы табе—не ў сілах,
Прасі бога днём і ночкай,
Пазаві яго на помач.

— Ой ты, татачка мой родны,
Не па-праўдзе ты гаворыш,—
„Бог на помач“ я чувала,
Як маленькаю ляжала. (²)

## ГОРКА ДОЛЯ ТЫ БАТРАЦКАЯ...

Горка доля ты батрацкая,
Гарапашная, жабрацкая —
Праца цяжкая, нязмерная,
Мазалёвая, сіберная —
На прыбыткі ды на панскія,
На папоўскія, дваранскія,
Гэй, збірайся, хлопцы жвавыя,
На расправы на крывавыя, —
На расправы — пажарышчамі,
Ад маёнткаў — папялішчамі. ([8])

## „ВЯЛІКОДНАЯ ПЕСНЯ"

А вялікдзень ідзець,
А нам нечага адзець.
А зялёны явар-кудравы.
Нечага надзець,
Недзе узяць.
(Прыпеў)
У багача прасіць,
Ён не дапаможыць.
(Прыпеў)
А поп скупы
Не парадзіць.
(Прыпеў)
У бедняка ўзяці
Няма нічога.
(Прыпеў)
Пайду я бедны
Да на пана працаваць.
(Прыпеў)
Працуючы у пана,
Не зарабіў грошы.
(Прыпеў)

Трэба будзе ў багача
Грошай пазычаці.
(Прыпеў)
Потым летам сенакос
Трэба адрабляці.
(Прыпеў)
Папу за яго малітву
Трэба аддаваці.
(Прыпеў)
А на сваім-жа шнуру
Трава пажаўцее...
(Прыпеў)
Пакуль свята тое прыдзе,
З голаду змарнееш.
(Прыпеў) (¹)

## ПА НАЧАМ Я ЎСЁ НЕ СПАЛА...

Па начам я ўсё не спала,
Сваё дзіцятка калыхала.
На прыгон работаць йшла,
І дзіцятка ў люльцы нясла.
Я сама не даядала,
Усё дзіцятку аддавала.
„Расці, мая дачушка,
Расці вялікая, Гануся".
Не ўбачыла маці дачушкі,—
Павялі яе ў панскі двор.
Прышла маці дамоў і горка плакала:
„А я дачушку гадавала,
Песціла, калыхала,
Думала: помач мне будзе.
Цяжка будзе сіраціне у чужыне жыць,—
За кавалак хлеба злым панам служыць".
Папы бачаць, маці плачаць.
Яны слёз нашых не знаюць
І паноў благаслаўляюць,
Каб яны людзей травілі,
Нашых дзетак загубілі.

Ах, праклятыя паны,
Ах, праклятыя паны,
Нашто дзіцятка маё вы забралі,
На мяне бяду, гора наслалі.
Спі ты, дзетка маё,
Мо' прыгожы табе сон прысніцца,
Будзе некалі і нам ладна жыцца. (5)

## АДПУСЦІЛІ СЯЛЯН „НА СВАБОДУ“[1]

Адпусцілі сялян „на свабоду“
Дзевятнаццатага феўраля,
Толькі землі не далі народу,—
Вось вам „міласць“ цара і дваран.

Мужыкі без зямлі прападаюць,
А дваране і рады таму,
Што забесцань яны навімаюць
Мужыкоў на работу сваю.

Прыціскае нас земскі начальнік
І ураднік дыхнуць не дае,
Поп пужае нас адам крамешным
І за трэбы тры скуры дзярэ. (6)

---

[1] Гэта песня была распаўсюджана на вёсцы ў 1905 г.

## НАС БУРЖУІ ПАДВЯЛІ...

*(Салдацкая)*

Эх, яблычка,
Залаценькае,
Нас буржуі падвялі,
Каб калолісь на штыхі.

Самі нашы афіцэры
Схаваліся па хатах,
А нас, змучаных салдатаў,
Выгналі ў атаку.

А папы, дык як шпіёны,
Пішуць нам запіскі—
„На афіцэраў не глядзіце,
Самі ўперад вы ідзіце". (7)

## ПАТАНУЛА ГОРКАЯ ДОЛЯ...

Патанула горкая доля,
Не будзе ёй звароту.
Прышла для народу воля,
Жыць стала у ахвоту.

Я раней папу служыў,
Гора колькі бачыў.
Поп смяяўся нада мною:
„Працуй,—кажа,—йначай".

А за цяжкую работу
Хлеба дасць пустога.
І схудаў і згаладаў я,
Ледзь цягаў я ногі.

Але ім мінуўся час,
Больш прыгону не чыніць.
Без папоў, без іх дурману
Сталі мы шчасліва жыць. (8)

√

## КАПЛІЦА

Каля нашай вёскі
Стаяла капліца,
І раней туды сяляне
Хадзілі маліцца.

Поп вадою гандляваў,
Яе „святою" называў.
Капліцу ля крыніцы будавалі,
Бо ваду адтуль і бралі.

Але высахла вада,
І вады не стала,
Так чаму-жа пападзя
Адразу пахудала?

А адказ тут ёсць адзін,
Ён для нас вядомы:
Поп з вады той зарабляў
Не на адны іконы. (9)

## СПАДЗЯВАЎСЯ ДЗЕД НА БОГА...

Зямлю сошкай касабокай
Калупаў стары Ігнат,
Конік той ледзь цягне бокам—
Крок уперад, два назад.

Спадзяваўся дзед на бога
І маліўся крэпка:
Дзе пасеяў ён авёс—
Вырасла свірэпка. (10)

## У КАЛГАСЕ ГУСТА РУНЬ ЗАЗЕЛЯНЕЛА...

У калгасе густа
Рунь зазелянела,
А ў Данілы пуста:
Што ўзышло—сапрэла.

Ледзве дзед набожны
Назбіраў асміну,
А калгас бязбожны—
Тону з дзесяціны.

Сумны дзед Даніла,
Вочы—у падлогу:
„Вось што нарабіла
Вера ў сілу бога“.

Плюнуў дзед на расу
І ў праўленне куляй:
— Братка, да калгаса
Прыпішы дзядулю. (11)

## ДЗЕД УЗЯЎ ІКОНЫ...

Дзед узяў іконы
Выкінуў за дзверы:
—Не мазольце мне вачэй,
Не псуйце шпалеры.

З богам былі, слёзы лілі,
Век жылі мы з плачам,
А без бога—хлеба, сала,
Ёсць усё з астачай.

Не клюй носам у падлогу,
Не маліся богу.
Няхай ён, бяздоліца,
Сам сабе памоліцца. ([11])

## „ЦУД“

За калгасам ля балота
Царква размясцілася.
Вось зусім нядаўна там
Цуда праявілася.

Гаварылі старыкі:
„Бог крывавыя слёзы лле,
І цяпер не ждзіце вы
Ужо літасці сабе“.

Нашы-ж хлопцы комсамольцы
Расказалі старыкам,
Што плывуць вось тыя слёзы
На карысць адным папам.

Паказалі, раз'яснілі,
Адкуль слёзы тыя шлі,—
За картон папы налілі
Падфарбованай вады.

З таго часу ўсё больш народу
Богу ўжо не веруе.
І ніякі ужо цуд
Не падманіць болей люд. ([18])

## МІНУЛАСЯ ПАПАМ СВЯТА...

Поп па вуліцы ідзе,
Крыж вялікі ён нясе,
Усю вёску ён прайшоў,
Усіх сялян ён абышоў.

Бярэ з кожнага ён дар:
З каго куру, з каго яйкі.
Сам-жа людзям кажа байкі,
Каб увесь свой век пасцілі,
А яму бы ўсё насілі.

Людзі бедныя папа просяць,
Апошні грош яму прыносяць,
Каб ён бога больш маліў,
Каб град жыта іх не збіў.

Але поп так жыў не доўга,
Народ кінуў верыць ў бога.
Мінулася папам свята,
Апусцела у іх хата. ([14])

## У БОГА ВЕРЫЦЬ ПЕРАСТАЛІ...

Папа злосць апанавала,—
Яго жыццё дрэнна стала.
Поп наш плача, лемантуе,
Слоў яго ніхто не чуе.

Хоць ты ў сценку лобам біся,
Людзі бога адракліся.
Поп да ручкі аж дабіўся,
Ў пустой цэркві не маліўся.

Поп наш лаецца, крычыць,
Судом божым пагражае:
„На тым свеце,—кажа,—вас
Шатан[1] ў пекла пакідае".

А мы бога не баімся,
Бо яго мы адракліся.
Мы навуку ўсю пазналі,
Ў бога верыць перасталі. ([15])

[1] Шатан—сатана.

# ПРЫКАЗКІ
# ПАГАВОРКІ
# ЗАГАДКІ

ДАРЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ПРЫКАЗКІ І ПАГАВОРКІ

БОГ

Бог та бог, ды і сам не будзь плох.

Богу маліся, а сам працуй, бо згаладуеш. (АФС)

На бога надзейся, а сам рук не апушчай. (Ф)

Надзейся, небожа, а сам сей збожжа. (С)

Праўду кажуць—сабачае жыццё мужыка: пан не дае, бог не дапамагае, а самому зарабіць няма дзе.

Бог жыве сабе на небе і не думае аб хлебе.

Смяяўся і плакаў, а ўсё бог адзінакаў. (АФС)

Чакаў збавення з неба, а там часам і хлеба трэба.

Да бога высока, да цара далёка. (Л)

Абяцаў бог даць, але казаў падаждаць.

Бог не бачыць з неба, што на падаткі грошы трэба. (Ф)

На табе, божа, што мне не гожа.

Госпадзі ў Рослаўлі, а прачыстая ў Мсціславе— а ўсе грошы выцісні.

Што богу здарылі, тое згубілі. (АФС)

Няхай тое чорт есць, што бог дасць. (Р)

Калі бог прыстане [прычэпіцца], то і хлеба не стане. (Ф)

Няхай ад бога табе так ідзець, як ён нам даець. (Л)

Да таго богу сміраліся, пакуль кішкі парваліся. (АФС)

У бога многа, але не для нас. (Л)

За тым і бог, хто бедака перамог.

За тым божа, што каго зможа.

І бог ашуканствам жыве: у аднаго адбярэ, а другому дасць. (Ф)

СВЯТЫЯ

Пакуль да бога, дык святыя душу вымуць.

Як чорт дасць гразь, то і святы не высушыць.

Сядзіць, рукі злажыўшы, як святы. (С)

Два Юр'і, абодва дурні, адзін халодны, а другі галодны. (Л)

Павел-Пятро такі, што як яму ні гадзі, а ён усё глухі. (СП)

РАЙ І ПЕКЛА

Рай і ад трэба таму, хто багат. (Ф)

А дзе пекла? А ў Альбрэставе. (Н)

[Паходзіць ад назвы іезуіцкага маёнтка—Альбрэстава. Гавораць пры ўспаміне аб цяжкім жыцці пры панах.]

ЦАРКВА, МАЛІТВА, ІКОНЫ.

Дзе поп царкву ставіць, там пан карчму ладзіць.

Адной малітвай грахоў не адбудзеш, заграбі хлеба капу і цягні папу. (АФС)

Даў-бы на малебен, але сабе патрэбен.

Маліся, хоць ты лоб расквась, усё роўна. (С).

Не дапаможа кадзіла, калі хвароба зваліла. (АФС)

Калі ў хаце бяда, дык не паможа святая вада.

З аднаго дрэва і крыж і лапата. (АФС)

Што абраз, то і афяра. (Ш)

Памагае, як змарнеламу кадзіла. (С)

ПОП І КСЁНДЗ

Папы і чэрці адной шэрсці. (АФС)

За папом чорт ходзіць следам, нібы цень. (СП)

У папа чорт у падкладцы, а сатана ў заплатцы.

Поп з крастом, а чорт з хвастом.

Поп у царкве скача, як чорт у пекле.

Ад папа, як ад чорта, не адхрысцішся.

Поп, цар і кат—адзін аднаму родны брат.

Селянін толькі і чуе дай: богу—на свечкі, цару—на падаткі, ксяндзу—на аплаткі.

Пан скуру здзірае, а поп душу вымае.

Уцякаў ад пана, а папаў да папа. (АФС)

Папы служаць не для Ісуса, а для хлеба куса. (С)

Поп жыве з алтара, а пісар з каламара (чарнільніца.) (Н)

Жытка (жыццё) папом і катцом (ка́там).

Галасі не галасі, а папова аддасі. (С)

Папа ўсе знаюць, а поп—багатых. (АФС)

Памёр багаты—па пяцёра папоў з хаты, а памёр бедны худачок, ідзе толькі дзячок. (Л)

Поп па кішэні малебен служыць.

Карман сух, дык і поп глух.

Поп, дзе чуе куццю, дык туды і ідзе.

Поп тады моліцца аб ураджаі, калі чуе, што многа дабра назбірае.

Поп „праведна“ жыве: з беднага дзярэ, да ў карман кладзе.

Маліся, хоць ты засіліся, а на папа [на пана] прапаваць трэба.

Адзін свечку, другі свечку—папу яшчэ адна авечка. (АФС)

Завіхаецца, як на папоўскай талацы [не спяшаецца]. (С)

У папа пуза таўсцее, а ў батрака спіна млее. (АФС)

У папа, кажуць, дзве рукі: адна,—што хрысціць, другая,—што бярэць, а той, што дае,—няма. (Ш)

„Дай—“любіць поп усялякі, а „на“—ніякі. (АФС)

Не так у папа валасы доўгі, як рукі. (Л)

У папа вочы завідушчыя, а рукі заграбушчыя.

У папа рукавы шырокія—усё ўлезе.

З паповых рукавоў вышла-б пяцёра штаноў. (АФС)

У яго папоўскія вочы. (С)

Поп і дзяк усё ціснуць у свой кулак.

Папоўскі карман—шырокі.

У папоўскай кішэні з галавой схаваешся.

Бяздонь, як папоў кішэнь: што не кладзі, назад не вернеш.

Мера—не папоўскі кішэнь,—дно мае.

У папа мяшок без дна. (АФС)

Папоўскі ты кішэнь. (Р)

Мяшок з папоўскай кішэні. (Р)

Поп і за жывога і за мёртвага бярэць. (Н)

Радзіся, жаніся і памірай, а ўсё папу грошы дай.

---

Адна радасць папу: што вяселле, што хаўтуры.

Каму мяртвец, а папу таварэц. (АФС)

Людзі „ой ды ой," а папу палатно свой [зрабі].

Каму клапатно, а папу палатно.

Людзі паміраюць—сям'я плача, толькі поп ды дзяк пяе і скача. (С)

Як болей магіл, дык таўсцей у папа блін.

Поп хоча вялікага прыходу, а сам чакае, калі хто памрэ.

Папу і вору ўсё ўпору—ад злодзея адаб'юся, ад папа не адмалюся.

Мужык толькі піва заварыў, а поп ужо з вядром бяжыць.

У папа не згніець, не згарыць, сваё ўзышча—не прападзе. (АФС)

Поп вуха адрэжаць [сваё возьме]. (Д)

У мужыка неўраджай, а тут яшчэ папу дай.

Конь любіць авёс, а поп, каб што прынёс.

Папу што сноп, што стог—усё мала.

Поп алтыны [грошы] любіць.

Поп на чужое дабро зазіраецца.

Скупы, як поп.

Поп капелюш здымае не для таго, каб віталі, а каб грошы давалі.

Поп ласкавы ў той час, як дасі яму сала ды кілбас.

Кожны благачынны любіць, калі носяць яму аўчыны.

Ласы, як поп на кілбасы.

Папова пуза на сем аўчын шыта.

Кожная раса [ряса] любіць смачнае мяса.

Поп і пятух не з'еўшы не пяюць. (АФС)

Білін, білін, на тарэлцы блін. (Н)

Каму пост, а папу мясаед.

Ідуць у папы дзеля смачнейшай яды. (АФС)

Толькі і гора папу, што жывот баліць. (Л)

Поп бледны, як пятак медны. (Н)

Ад таго і поп гладак, што наеўся ды і набак.

На што папу тужыць, яму і так набяжыць.

Папы звоняць, бо іх на паншчыну не гоняць.

Папы—трутні, жывуць на плутні.

Папу і дзяку не вер, як сабаку.

Як сабака брэша, так поп язык чэша.

Абвясціў поп цуд, хай збярэцца люд.

Поп складна лжэ і не чырванее.

Чытае: „Да будзе воля твая“, а сам думае— „каб мая“.

Абманвае, як поп, і не краснееџь.

Папа і ў ступе таўкачом не пападзеш—так ілжэ.

У папа на вуснах мёд, а на сэрцы лёд.

Поп людзей карае, а сам што вытварае. (АФС)

Айцец Іван быў п'ян, айцец дзякан поўз ракам.(Д)

Панамар грошы ābабраў. (Л)

Алтарысты і арганісты—усе на рукі не чысты.

На пацеры ксёндз дагадаецца, але працаваць не збіраецца. (АФС)

Ксёндз і поп знаюць, калі свята, бо не робяць. (Л)

Ксёндз кажа—падай, божа, што высока, а што нізка, дык я сам вазьму.

Не так будзе, як поп кажа, а так будзе, як мужык зробіць.

Чоткі на руцэ, а дзеўкі на уме.

Кадзіла, кадзіла, не аднаго ты ўхадзіла, уходзіш ты і таго, хто дзяржыць яго.

Няхай папы не радуюцца, прыдзе і на іх радуніца. (АФС)

МАНАХІ

Ігумен ходзіць каля гумен.

Манах бяжыць ад работы, як чорт ад крыжа.

Калі-б у манастыры дровы рубалі, туды-б не ўцякалі.

Чарней за манаха не знойдзеш.

Гэта проста іезуіт.

Калі-б не страх, то-б звёўся манах. (С)

## СВЯТЫ

Не да каляд, калі загад. (С)

Якія тут святкі, калі лупяць падаткі. (Л)

Якія тут святкі, калі бяруць і астаткі. (С)

Ад усіх багоў па сапагу, а ад прачыстай па чаравічку. (Р)

Хто празнікаў пытае, той сарочкі латае. (ЗР)

Сена бы шапран, а ён святкуе. (С)

Пост—не мост: аб'ехаць можна. (АФС)

## СОВЕЦКІЯ ПРЫКАЗКІ І ПАГАВОРКІ

Абразы і малебны — больш нам непатрэбны.

У нас тут і без бога светлая дарога.

Знаюць і цудатворцы, што мы не багамольцы.

Людзі пасвятлелі, папы пахмурнелі.

Папу не веру, бо ён брэша без меры.

Хто папу верыць, той гора асмінай мерыць.

З папом дружыць, дурнем быць.

Хто папа гадуе, той сам пашкадуе.

Паверыў папу, што ўсё ад бога, і сабраў хлеба адну капу, а каб не верыў, — я-б хлеб асмінамі мерыў.

Маліўся богу—не было толку, стаў у калгасе рабіць,—стала добра жыць.

Не спадзявайся на бога, будзе з калгаса падмога.

У калгасе без малітвы родзіць добра жыта.

Мы і без бога ўстроілі, што ўраджай патроілі.

Зараз бога—а ні да парога.

Можам бога навучыць, як хлеб радзіць.

Вязі гной, не лянісся, ды і богу не маліся.

Не маліся богу, дабрадзей, а ары глыбей.

Не крапідлам машы, а глыбей пашы.

Поп маліўся, каб калгас разваліўся, ды і лоб разбіў.

Папу і кулаку ад калгасных варот—круты паварот.

Поп і дзяк адно думаюць, што і кулак.

Пры Совецкай ўладзе поп у селяніна грошы не ўкрадзе.

Праз рэлігійны дурман поп набіваў сабе карман.

Поп, ксёндз і равін розным багам хвалу аддавалі, а з адной казны грошы бралі.

Карысці з цябе, як з папа.

Вянец — не крапец[1].

Крыжам любві не звяжаш.

Шаптухам не вер, у нас ёсць дактары цяпер.

Не падай духам і не вер шаптухам.

Скончыўся папоўскі век, бо ў бога не верыць чалавек. (АФС)

---

[1] Старая прыказка—Вянец крапец.

## ЗАГАДКІ

**СТАРЫЯ**

Трое жывуць, скуру дзяруць, голымі пускаюць. — Хто адгадае? (Пан, поп і стараста).

Сам барадаты, пузам багаты. (Поп)

Мядзведзь, не мядзведзь, а пчол абдзірае. (Пан, поп)

Вош, не вош, а за мужыцкім каўняром жыве. (Пан, поп)

Шэсць дзён гуляе, а сёмы „работае" і торбу грошай бярэ. (Поп)

Хто з жывога і з мёртвага бярэ? (Поп) (С)

Кадзіла ў руках трымае, кадзілам махае, з кадзіла дым прэцца.—Як ён завецца? (Поп)

Поўны хлявец авец, а пасярэдзіне баран бляець. (Поп)

Многа трэба,—кажа,—для неба, а ён не аддае, ды сам жарэ. (Поп) (АФС)

Служыць саборна, а есць падворна. (Поп) (АФС)

І ў царкву ходзіць, і людзям шкодзіць. (Поп) (Л)

Божую хвалу за хвост цягаюць, хвала крычыць, што хвост баліць. (Царкоўны звон) (Ш)

На кращчэнскую каляду вылі ваўкі на ляду. (Крэсны ход на іордань) (Р)

новыя

Ходзіць па хатам, людзей дурманіць, пра бога маніць. (Поп)

Яна не воласць, не карчма, а шмат няслі туды дабра. (Царква)

Хто, глянуўшы высока ўверх, скрыпае зубамі і чаму? (Поп,—таму, што высока на царкве замест крыжоў—чырвоны сцяг) (АФС)



# ЧАСТУШКІ



## НЕПАТРЭБНА НАМ ЦАРКВА,— ВУЧАЦЬ КНІГІ ЛЕНІНА...

Больш ужо ікон не трэба,
І без іх мы пражывем.
У нас ёсць таварыш Ленін,
Па яго стапам ідзем.

Я хадзіла па саду,
А у садзе зелена.
— Непатрэбна нам царква,—
Вучаць кнігі Леніна.

А я богу не малюся,
Крыж на шыі не нашу.
Ленінізму я вучуся,
Ў клуб калгасны я хаджу.

Ад малітв няма карысці,
Не гарыць ў мяне свяча.
Нам прарок Ілля не трэба,—
У нас лампа Ільіча.

Я пры Сталіне прышла
Да жыцця заможнага.
Нарысую я плакат
Для кутка бязбожнага.

Не хаджу я у царкву,
Не малюся богу.
Паказаў нам Сталін наш
Лепшую дарогу.

Мы папоўскіх свят не знаем
І ў царкву мы не пайдзём.
Нас вядзе вялікі Сталін—
Мы па-новаму жывём.

Мы цяпер жыццё пазналі
І не клонімся багам.
Нас прывёў таварыш Сталін
К ясным, светлым шчасця дням.

Мы не верым больш у бога,
І ў царкву мы не ідзём.
У нас ёсць любімы Сталін,
Мы яго ўсе беражом.

У мяне у хаце чыста,
Электрычаства гарыць.
На сцяне няма ікон,—
Партрэт Сталіна вісіць. (1)

## ПОП МАНІЎ К САБЕ Ў ЦАРКВУ,
## УСІМ ДУРМАНІЎ ГАЛАВУ...

Стаўце вушкі на макушкі,
Зрэжам пасху на карню.
Вось праўдзівыя частушкі
Пра папоўскую хлусню.

А у старыя часы
Перад святам хадзіў поп,
Ён збіраў з людзей падатак,
Зацямняў увесь народ.

Поп маніў к сабе ў царкву,
Ўсім дурманіў галаву,
Каб няслі яму за гэта
Мяса, сала і муку.

Поп на пасху казаў людзям—
„Кайцесь, кайцесь ад граха".
З аднаго бярэ яечка,
А з другога—петуха.

Раней цёмныя сяляне
Нідзе не вучыліся,—
Была „школай" ім царква,
Там яны маліліся. .

А калісці ў нашых вёсках
Ой, стаяла шмат царквей.
Поп чытаў у іх малітвы,
Зацямняў розум людзей.

Гаварыў раней нам поп:
„Ў гэтым жыцці мучымся,
А як ляжам мы у гроб,—
Ў раі ўсе ачуцімся".

„У нас поп такі набожны",
Гаварыў царкоўнік кожны,—
„Ён характар добры мае,
Ў рай паслаць ўсіх абяцае".

Раней мы ў царкву хадзілі,
Слухаць пропаведзь папа,
А папы нам гаварылі:
„Баба—мужава раба".

На сцяне ў адной бабулі
Лампадачкі віселі.
Дом згарэў, а хто быў вінен,—
Людзі зразумелі.

Пад гарой пустуе цэркаў,
Клуб з народам на гары.
Эх не дарам, эх, не дарам
Пелі пулі ў Окцябры. (²)

МЫ НЕ ВЕРЫМ БОЛЬШ У БОГА,
ШЧАСЦЕ НАМ ПРЫНЁС КАЛГАС...

Як мы цёмныя былі,
Дык дурылі нас папы.
Як ў калгас мы ўсе ўступілі,
Папы ад злосці аж завылі.

Кулакі паджалі хвост,
А папы завылі,
Як у вёсцы мы калгас
Сёлета стварылі.

Кулакі вы, кулакі,
Папоўскія галовачкі.
Не удасца вам сарваць
Хлебанарыхтовачкі.

Бедната, цясней рады,
Прэч папы і гандляры!
Прэч кулак, павук няволі,
Панаваць табе даволі!

Прасею чысценька муку,
Замяшу я цеста.
Ні папу, ні кулаку
Няма ў калгасе месца.

Раней мне жылося дрэнна,
У папа кароў я пас, -
А цяпер мне жыць вясёла,
Бо заможны наш калгас.

Дваццаць год я крыж насіла,
Багамольнаю была,
— А цяпер крыжа не трэба—
Да заможнасці прышла.

Колькі богу не малілась,
Усё бедная была,
У калгас як я ўступіла,
Дык заможна зажыла.

Я раней спіну ламала
Багацею і папу,
А цяпер усё я маю—
Хлеб, і сала, і муку.

Восем год ў папа служыла,
Гора я спазнала,
А вось зараз я ў калгасе
Старшынёй абрана.

Раней богу я малілась
І галоднаю была.
Цяпер з богам разлічылась,
Я заможна зажыла.

Перасталі богу верыць,
Перасталі лоб хрысціць.
Сёння ўся ўжо наша вёска
Па-совецку стала жыць.

Раней людзі у царкве
Лбы ад гора білі,
А цяпер мы новы свет
Для сябе зрабілі.

Верыць кінула у бога,
Бо я комуністка.
А мой мілы трактарыст,
А я трактарыстка.

Мы па-новаму жывем,
Жыццё калгаснае куем.
З кожным днём усё дружней,
Без кулакоў і без царквей.

Бога мы даўно забылі
І без бога мы жывем.
Усе ў калгасы мы ўступілі
І заможна зажывем.

Ад папоўскага дурмана
Адвучыла школа нас.
Мы не верым больш у бога,
Шчасце нам прынёс калгас.

Дні ўжо новыя настaлі,
К нам прышоў вясёлы час:
З царкві клуб мы збудавалі,
Жыць заможна стаў калгас.

Поп і дзень і ноч маліўся,
Каб калгас наш разваліўся,
А калгас наш ўсё красуе,
Поп ад злосці аж гаруе.

Заспявалі птушкі ў лесе,
Заспяваў і салавей.
Перасталі богу верыць,
Жыць нам стала весялей.

Пад вакном стаіць бяроза,
На галіне—салавей.
Без папоўскае малітвы
Жыць нам стала весялей.

Ў адзіночку мы не пашам,
Богу мы не молімся.
Вясна прыдзе, ў полі нашым
Мы калгасам строімся.

У калгасе „Перамога“
Мы жывем дванаццаць год
І не верым больш у бога,
Бо пісьменны мы народ.

Наш калгас багат, вялікі,
Усяго ёсць многа,
Бо па-новаму працуем
Без папа і бога.

Наш калгас цяпер багаты,
Моцны маем мы даход,
Нам цяпер, вучоным людзям,
Непатрэбен зусім бог.

Люблю калгаснае я поле,
Люблю бязмежну паласу,
Богу я цяпер не веру,
Папу й граша не панясу.

Падпісалі дагавор
Вось які калхознікі:
Каб у цэркву ні нагой,
А двума—ў бязбожнікі.

Не гудзіць ужо царква
Званамі няспыннымі,
Сёння поўніцца прастор
Песнямі машыннымі.

Не маланка там іскрыцца,
Не Ілья-прарок грыміць,
То з слупа на слуп ў калгасы
Электрычнасць пабяжыць.

Спадзяецца хто „на неба",
Той застанецца без хлеба.
Мы навуку паважаем,
Значыць будзем з ураджаем.

Мы ў царкву не пойдзем з Грышкам,
А ў чытальню пагуляць.
Пачытаем сабе кніжку,
Як палепшыць сенажаць.

Поп раней глядзеў на неба,
Кажа—сеяць ужо трэба.
А мы навуку паважаем,
Самі будзем з ураджаем.

У калгасе нашым мы
Культуру узмацнілі,
Папу грошай не давалі,
Сеялку купілі.

У калгасе „Новы быт"
Трактары аралі,
Без папа і кулака
Ураджай сабралі.

Мы па-новаму жывем—
У царкву не ходзім,
Поле трактарам арэм,
Севазварот уводзім.

Хнычуць, енчаць багамольцы—
Ў храм не ходзяць камсамольцы.
Поп рэбятам не патрэбен,—
Верацъ ў трактар, не ў малебен.

Няхай поп не кліча нас,
На бога забываемся.
Ў цэркві мы не молімся,
На сяўбу збіраемся.

Над палямі раней поп
Раздуваў кадзіла,
А у нас тут і без бога
Ураджай надзіва.

Ураджай вялікі далі
Добра ўгноены палі.
Нам кадзілам не махалі
Доўгагрывыя папы.

Нам малебны непатрэбны,
Гэта ты і памятай,
Што ў калгасе без малебна
Падымаем ураджай.

Каб радзіла хлеба ўтрое,
Мы да бога не ідзем,
Запражэм каня стальнога,
Агранома прывязем.

Няма карысці ад малітвы,
Ад „свянцонай“ ад вады,
Хто паложыць угнаенне —
Апраўдае ў тры разы.

Мы дажджу не просім ў бога,
Нам прырода дождж дае.
Ні адзін жыхар краіны
За дажджом к папу не йдзе.

Што нам Улас, што нам Спас,
Што нам багародзіца.
Зараз ў нас ужо без іх
Хлеб прыгожа родзіцца.

Як у нашым у калгасе
Хлеб на ніве, нібы гай,
Бо калгаснікі без бога
Узмацняюць ураджай.

Сталі ўдарныя брыгады
На палеткі у разлог,
У такой дружнай рабоце
Непатрэбен зусім бог.

На калгасныя палі
Ажно глянуць міла.
У багоў не верым мы,
А ўсё расце надзіва.

Болей „цудам“ мы не верым,
Яны толькі шкодзяць,
Бо у нашым-жа калгасе
Хлеб без бога родзіць.

Сеем, пашам, барануем
Без папоў і кулакоў.
Мы рыхтуем к абароне
Варашылаўскіх стралкоў.

Папы чуткі распусцілі,
Што раскідаўся калхоз,
А калхоз наш, як надзіва,
На сто га яшчэ падрос.

Поле трактарам аралі,
Ураджай вялікі знялі,
Індустрыі—першы сноп.
Зло шыпяць кулак і поп.

Не пайду я больш у цэркаў,
А пайду лепш у калгас,
Бо калгасны шлях шчаслівы,
Стаў ён радасным для нас. (8)

## ЗАМЕСТ ЦЭРКВЫ МЫ ЎЖО МАЕМ НОВЫ, ЧЫСТЫ, СВЕТЛЫ КЛУБ...

Раней пойдзеш у царкву,
Б'еш падлогу сваім лбом,
А цяпер у нашым клубе
Пяе песні патэфон.

У лясочку на пясочку
Вырастае моцны дуб.
З хат мы вынеслі іконы,
А з царквы зрабілі клуб.

Каля лугу, за палянай
Распусціўся стары дуб.
Дзе царква была гадамі,
Там цяпер красуе клуб.

„Дзілінь-бом, дзілінь-бом",—
Годзе біць ў зямлю ілбом.
Ў нашай вёсцы была цэркаў,
А цяпер культурны дом.

Ў царкве сельскай, дзе папы
Нам пра бога лгалі,
Мы ўчора клуб калгасны
Там арганізавалі.

Непатрэбны нам замовы
І малебны, і іконы.
Спробы ўсіх папоў—напрасны:
Замест цэрквы-клуб калгасны.

Муку, сала і яечкі
Папу больш я не аддам.
Не гараць у цэркві свечкі,—
Ужо клуб калгасны там.

Сярод вёскі, дзе царква
Вочыназаляла,
Там вясёлаю гурбой
Моладзь загуляла.

Я з рэлігіяй парвала—
У царкву больш не хаджу.
Лепш у клубе з сваім мілым
Я за кніжкай пасяджу.

Не пайду я больш у цэркаў,
Не буду маліцца.
Лепш пайду у клуб калгасны
Буду весяліцца.

Колькі радасці і шчасця
У калгасе ў нас ужо,
Збудавалі нам советы
Школы, яслі, клуб, кіно.

Хай папы у царкві звоняць,
Хоць ілбамі ў звоны б'юць,—
Ўсе старыя і малыя
У калгасны клуб ідуць.

Выйду я ды з сваёй хаты,
Пайду ў клуб кіно глядзець.
На папоўскую царкву
Не хачу цяпер глядзець.

До' хадзіць нам у царкву,
Досыць нам маліцца,—
Лепш ісці усім у школу,
Каб чытаць научыцца.

Не ругай ты мяне, мамка,
Не пайду я у царкву,
Лепш пайду у клуб совецкі,
Пачытаю там газеткі.

Мы царкву цяпер забылі,
Не глядзім мы на яе.
Мы ўсе ходзім у клуб калгасны—
Патэфон там нам пяе.

Зняла мамачка ікону,
Прымушала цалаваць.
Я мамашы адказала—
Пайду лепш у клуб гуляць.

Селі гусі каля броду,
Селі, палі на ваду.
Ой, няма папу даходу,
Людзі у цэркаў не ідуць.

Ходзіць баця, енчыць дужа,
Цэркаўка закрылася,
Бо адна бабулька толькі
З вёскі ўсёй малілася.

Папам жыццё стала туга,
У царкву не згоніш пугай.
Людзі ўсе паразумнелі,
„Сілу“ бога зразумелі.

Не курыць у хаце ладан,
І лампадка не гарыць.
У Совецкай-жа краіне
Сталі ўсе культурна жыць.

Зараз у краіне нашай
Людзі ўсе змяніліся:
Няма равінаў і папоў —
Культурнымі зрабіліся.

Больш не ходзім мы ў царкву,
Не бяром святой вады,
Больш дароў папам не носім,
Жывем, не ведаем бяды.

Цяпер у цэркві больш не звоняць,
І званоў ўжо не чуваць,
Людзям звоны надаелі,
Лепей песні нам спяваць.

Ў вёсцы цемра ўжо адпала,
Дні насталі вольныя.
Не пачуеш ты ўжо там
Звона калакольнага.

Не кукуй, зязюля шэра,
Не на тую ветку села.
Не звані, поп, у званы,
Нам не трэба больш яны.

Не званіце, не спявайце,
Два пабітыя званы,
Бо ніхто ў царкву не пойдзе,—
Няма бога і маны.

Засвяціла сонца ясна,
Вочы нам не есць туман,—
У царкву мы больш не ходзім,
Бо рэлігія дурман. (4)

## НЯХАЙ ПОП НЕ ДАЖЫДАЕ, НАС АЖЭНІЦЬ СЕЛЬСОВЕТ...

Палюбіла я мілога
Лепей брата і сястры.
Мы жаніліся без бога,
Жыццём новым зажылі.

Вышываю я платочак,
На ражку чырвоны цвет.
Няхай поп не дажыдае,
Нас ажэніць сельсовет.

Нашы рэчанькі крутыя,
Вада льецца, пеніцца.
Нашы хлопцы маладыя
Па-совецку жэняцца.

Не пайду ў царкву маліцца,
На даклад пайду я ў клуб.
Калі буду я жаніцца,
Ў сельсовеце вазьму шлюб.

Ой, іграй, іграй, гармошка,
Каб нас чулі на ўвесь свет.
Я вянчацца не паеду,
Запішусь пайду ў Совет.

Эх, звініце, вы, капыты,
Па дарозе ў Выканком,
Бо па-новаму там быту
Нас запішуць за сталом.

Я у цэркаў не хадзіла,
Богу не малілася.
Комсамольца палюбіла,—
З ім і пажанілася.

Мяне знае ўсё сяло,
Дзеўкай маладзецкаю.
Абвянчалась з сваім мілым
Толькі па-совецкаму.

Маё сэрца прыуныла,
З мілым я расталася,—
У цэркаў зваў мяне вянчацца,
А я адказалася.

Болей я папу не веру,
Ў цэркві не малюся.
Комуніста я люблю,
З ім і запішуся.

Нашых дэтак-малалетак
Ў цэркві не хрысцілі,
Акцябрылі іх у клубе,
Ў купель не лажылі,

На гары стаіць дуб,
Пад гарой каліна.
Наша Мар'я у папа
Не хрысціла сына.

Над ракой стаіць каліна,
А над возерам вярба.
Ў мяне сёння акцябрыны,
Абышоўся й без папа.

Абыйдуся без крапідла,
Я не знаюся з папом.
Мяне й маці не хрысціла,
Не была я й пад вянцом.

Не святкую я ні пасхі,
Не святкую і каляд.
Мае дзеці сыты, чысты,
Цяпер добры ім прыгляд.

Не пасціла я у пост,
Пасху не свяціла.
Зімой з дочкаю я разам
На лікпункт хадзіла.

Не жадаем мы спраўляць
Цяпер дні „святыя".
Першы Май наш і Кастрычнік—
Святы дарагія.

Рэлігійныя абрады
Забываюцца навек.
Без папоўскага абману
Жыве вольна чалавек.

Па палетках растуць кветкі
У зялёненькай траве.
Толькі тры у нас кабеткі
Спавядаліся ў царкве.

Вышла бабка праважаці
Ў армію з іконамі,
А мы бабцы адказалі:
Лепш з краснымі знамёнамі.

Парашылі матка з бацькам
І старэйшыя сыны
Непатрэбныя іконы
З хаты вынесці з вясны.

А Аксіння вой, ды вой,—
Лечыць поп „святой“ вадой.
А захварэў калі ён сам,
Дык за доктарам паслаў.

У нас шмат ёсць санаторый,
У нас многа ёсць бальніц.
Нам не трэба загавораў
Шаптух—божых памачніц. (5)

## БОГ ЗУСІМ НАМ НЕПАТРЭБЕН, КАЖА КОМСАМОЛАЧКА...

Нас не любяць, нас баяцца
Поп кудлаты ды кулак.
Парашыў за працу ўзяцца
Комсамольскі маладняк.

Пракацілася па небу
Ясненькая зорачка.
Бог зусім нам непатрэбен,—
Кажа комсамолачка.

Зараз новыя часы,
Бога ўсе забылі,—
Комсамольцы на сяле
Новы клуб адкрылі.

У царкву я не хаджу,
Я не багамолец.
Яшчэ трохі падрасту—
Буду комсамолец.

Я не верую ў бога,
Не малюся я Хрысту,
Бо радзілася шчаслівай,
Комсамолачкай расту.

Не малюся я ўжо богу,
Не малюся я Хрысту.
Не б'ю лобам аб падлогу,
Комсамолачкай расту.

На шырокім полі ў жыце
Пяе перапёлачка.
Кіну верыць я у бога,
Буду комсамолачка.

Не гані, ты, мамка, ў цэркаў
Я не багамолка,
Я жыву ў СССР,
Буду комсамолка.

Зараз людзі не гавораць,
Што я багамолка,
Я у цэркаў не хаджу,
Бо я комсамолка.

Ў нас за вёскай ёсць гара,
Пад гарой дарога.
Комсамольцы больш не вераць
Ні ў якога бога.

Я з рэлігіяй парвала,
Сувязі не маю
Ў комсамол я уступіла,
Многа кніг чытаю,

Не буду богу я маліцца,
Не буду у царкву хадзіць,
Пайду ў школу я вучыцца,
Трактарысткай хачу быць.

Эх, іграй, мая гармошка,
Весялей наводзь лады.
Не хачу „святой“ я пасхі,
Я калгаснік малады.

Комсамольца палюбіць,
Трэ' перамяніцца:
Больш у цэркаў не хадзіць,
Богу не маліцца.

З комсамольцам гуляць,
Трэ' перамяніцца,
Крыж на шыі не насіць,
Богу не маліцца.

Наша рэчанька глыбока,
У ёй рыбы многа.
А мы вучні-комсамольцы
Не верым у бога.

Раскідаю, разбрасаю
Па гары калінушку.
У бязбожным я гуртку
Працую цэлу зімушку.

Гаварыла дзеўка Маня,
Гаварыла Мішава:
Для бязбожнага кутка
Я плакацік вышыла.

Я не біблію чытаю,
Не псалтыры я вучу,—
Я вінтоўку разбіраю,
Яе часткі знаць хачу.

Давялось на службе Ване
Палятаць на аэраплане.
Неба ён наскрозь прайшоў,—
На небе бога не знайшоў.

Выйду я на сенажаць,
Буду песенькі спяваць
Пра хлусню папоўскую,
Пра ману дзякоўскую.

Супроць казак старай веры,
Зацямняючых умы,
Выступаюць піонеры.
Піонеры—гэта мы.

Не званіце больш званы,
V Я ўжо хлопец не дурны.
Ў рай нябесны не хачу я,
Тут мы лепшы пабудуем. (6)

## НАВАТ СІВЫ ДЗЕД-БЯЗБОЖНІК ЎЖО НЕ МОЛІЦЦА ЦЯПЕР...

Дзед старэнькі ля парога
Заявіў—не веру ў бога.
Хлеб дае нам не хрыстос,
А машына і калхоз.

Наша бабка асмялела,
У царкве сказаць эдалела:
— Трачу час я задармо,
Лепш пайду глядзець кіно.

На васьмым дзесятку бабка
Адраклася ад ікон,—
Завяла сабе прыёмнік
І купіла патэфон.

Богу я раней малілась,
Бабкай цёмнаю была.
А цяпер паразумнела,
Кнігі Леніна ўзяла.

Пойдзем новаю дарогай,
Ганна, Тодар і Астап.
Кінем верыць мы у бога,
У Ісуса і хрыста.

А у полі дзве бярозкі,
Расцвілі яны цяпер.
Нават сівы дзед-бязбожнік
Ўжо не моліцца цяпер.

Хутка, хутка ўсе калгасы
Тэлефонам звяжуцца.
Хутка, хутка ўсе старухі
Ад папоў адкажуцца.

На каляды дзед Мікола
Не пайшоў маліцца.
Заявіў усім у школе:
— Я хачу вучыцца.

Доўга дзед пра бога думаў,
А пасля усім сказаў:
— Багоў трэба ужо з хаты,
Досыць ім паклоны клаў.

Дзед маліўся абразам,
Біў паклоны нізенька,
А учора запытаў:
— Што такое фізіка?

Пагражае поп мне адам:
„Я ад царквы адлучу!"
— Адлучай, бо я ўжо ў байкі
Болей верыць не хачу.

Перастаў я верыць у бога
І адрокся ад царквы.
Мы не вернемся ніколі
Да мінулай цемнаты.

Эй, папы, зірніце ўгору,
Як высока мы ляцім.
Мы у бога больш не верым,
Знаем бог нас корміць чым.

Распусцілася бяроза,
Ліпа ў кольцах залатых.
Мы „Бязбожніка" чытаем,
Адракліся ад святых.

Клубы, школы, культпрасветы,—
Стаў разумны мужычок.
На бязбожную газету
Лепш аддаць нам пятачок.

Як непісьменнаю была,
У царкву часцей ішла,
А кніг многа прачытала,
У царкву хадзіць не стала.

Я вазьму платок у рукі,
Разганю ў полі туман,
Мы дазналіся з навукі,
Што рэлігія дурман.

Шэры вутачкі ляцелі,
Разагналі ўвесь туман.
Мне падруга гаварыла,
Што рэлігія дурман.

Я раней малілась богу,
Непісьменнаю была,
А цяпер багоў не трэба,
Кніжку ў рукі я ўзяла.

Кінуў лапці на балота,
Не трэба мне евангелле.
Непатрэбна ўсё старое,
Горад вучыць нас на тое.

Надышла нядзеля,
Не пайду маліцца,
Стары час адышоў,
Лепш пайду вучыцца.

Гаварыў нам поп усім строга,
Што да бога ёсць дарога.
А у нас тут і без бога
Наўсцяж светлая дарога.

„Комінтэрн"—завод вялікі,
Стаханаўцаў многа.
Мы работу ўсю праводзім
Без папоў і бога.

Я стаханаўкаю стала,
Богу не малюся,
І ў царкву я не хаджу,
Працай ганаруся.

Выйду, выйду на дарогу,
За высокі за курган.
Не малюся больш я богу
І не верую ў дурман.

Пад ваконцам на дварэ
Выраслі два дубікі.
Мы цяпер—не багамольцы,
Знае ўся Рэспубліка. ([7])

## НЕ ХАВАЙСЯ, ПОП З ШПІЁНАМ, МАСКУ МЫ З ЦЯБЕ САРВЕМ...

Як ішоў на нас Дзянікін,
Завязалась бітва,
Хвост прыцiснулі яму,
Не спасла малітва.

На Паволжы людзі мерлі,
Голад там людзей касіў,
А поп Ціхан ўсе багацці
Да сябе у склеп знасіў.

Поп гатоў служыць шпіёнам,
Але хай ён не шыпіць,
Бо чэкіст у нас ў дазоры
На мяжы сваёй стаіць.

Жывем мы радасна, шчасліва,
Песні новыя пяем.
— Не хавайся, поп з шпіёнам,
Маску мы з цябе сарвем.

Папа рымскі у царкве
Дзве начы маліўся.
Ды жывуць большэвікі,
Папа памыліўся.

Сядзяць поп з дзяком ў царкве,
З гора „Лазара“ пяюць,—
Людзі ў бога больш не вераць,
З імі справы не вядуць.

Уміляўся поп да слёз,
Думаў ходз іконамі.
Абазнаўся: йшоў абоз
З хлебам і знамёнамі.

На бярозе сядзіць шпак,
На ялі кукушка.
Дзюбы звесілі папы—
Драпежныя птушкі.

Пападзя старая зліцца,—
Не яе ужо зямліца.
Не аддасць яе ва век
Наш калгасны чалавек.

Хай буржуй, кулак трасецца,
Свайму богу моліцца.
Нам ўсім весела жывецца
І работа спорыцца.

Ходзіць поп, павесіў нос,
Думкі ў яго сумныя,
Бо ўся моладзь на сяле
Стала ўжо культурная.

Ходзіць поп, збірае грошы,
Аднавіць каб алтары,
А мы грошы не дадзім
Ды закупім трактары.

Ой, пад мостам рыба з хвостам
Зачапілась за слупы.
Не знайсці такіх прахвостаў,
Як манахі і папы.

Ой, цяпер-жа папам
Стала вельмі нудна,
Бо культурны стаў народ,
Абманваць трудна.

Пападзя зуеім схудзела,
Галаву павесіла,
Што без бога і святых
Жыццё наша весела.

Ў нас папам няма работы,
Поп ад гора посціцца,
Ён на працу падаецца,
Ў трактарысты просіцца.

Эх, зіма, зіма, зіма,
Выжыў попік ды з ума,
Па дзярэўні носіцца,
Ў трактарысты просіцца.

Паглядзіце, хлопцы, вы,
Што ў цэркві адбываецца:
Поп абедню служыць п'яны,
Ледзь на нагах трымаецца.

Поп увесь час добра жыў,
З людзей скуру ён лупіў,
Але ўжо мінуўся час,
Поп адвыкнуў ад кілбас.

На дарозе сярод лесу
Моцна плача стары поп:
„Для мяне няма даходу,
Стаў культурны ўвесь народ".

На гары стаіць манах,
Моліцца ён богу.
Яму трактар перасек
Назаўжды дарогу.

Я не верую ксяндзам
У руцэ з-аплаткаю.
Я на з'езд Советаў еду,—
Абрана дэпутаткаю.

Кіньце, бабкі і дзядулі,
Да папа хадзіць спяваць.
Сабірайцеся, старыя,
Дэпутатаў выбіраць.

Даўно кінуў у балота
Я старыя псалтыры.
Ўсе на выбары пашлі мы,—
І стары, і малады.

Поп зрабіўся „рыбаком“,
Сплёў сабе ён сеці,
„Галаскоў,—кажа,—навуджу,
Буду я ў Совеце“.

Поп ды з выбараў ішоў,
Дыбам сталі валасы.
Людзі Сталіну свайму
Аддалі ўсе галасы. ([8])

# ЗАЎВАГІ

## КАЗКІ І АНЕКДОТЫ

1. Е. Романов, „Белорусский сборник", вып. IV, 1891 г.
2. Зап. у к-се „VI з'езд Советаў", Бешанковіцкага р., 1936 г.
3. Е. Романов, „Белорусский сборник", в. XI, ч. I. Архіў фальклорнай секцыі АН БССР (рукапіс).
4. Зап. у к-се „Шлях Сацыялізма", Чырвонапольскага с/с., Магілеўскага р., 1936 г.
5. Зап. у Магілеўскім р., 1937 г.
6. А. К. Сержпутоўскі, Казкі і апавяданні беларусаў, 1926 г.
7. Са зборн. М. Федароўскага, „Lud białoruski...", т. III, ч. II, 1903 г.
8. Зап. у Магілеўскім р., 1938 г.
9. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.
10. Е. Романов, „Белорусский сборник", т. I, вып. 1—2, 1885 г.
11. Зап. у в. Н. Уюнішча, Казловіцкага с/с, Глускага р., 1938 г.
12. Зап. у к-се „Пераможац", Мастоцкага с/с, Магілеўскага р., 1937 г.
13. Зап. у в. Туравічы, б. Машкоўскай вол., Аршанскага павета, 1913 г.
14. Зап. у Менскім р., 1931 г.
15. Зап. у к-се імя Ільіча, Славенскага с/с, Шклоўскага р., 1938 г.
16. Е. Романов, „Белорусский сборник", вып. XII, Архіў фальклорнай секцыі АН БССР (рукапіс).
17. А. К. Сержпутовский, Сказки и рассказы белоруссов-полешуков. СПБ, 1910 г.
18. Са зборн. П. В. Шейна „Материалы...", т. II, СПБ, 1893 г.

19. Зап. у Бялыніцкім р., 1936 г.

20. Зап. у в. Мужанка, Лошніцкага с/с, Барысаўскага р., 1927 г.

21. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

22. Е. Романов, „Белорусский сборник", в. XII. Архіў фальклорнай секцыі АН БССР (рукапіс).

23. Зап. у Менскім р., 1936 г.

24. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

25. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

26. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

27. Зап. у к-се імя Молатава, Парыцкага р., 1937 г.

28. Зап. у в. Галавінцах, Гомельскага р., 1936 г.

29. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

30. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

31. Е. Романов, „Белорусский сборник", вып. XII, Архіў фальклорнай секцыі АН БССР (рукапіс).

32. Са зборн. М. Федароўскага, т. III, ч. II, 1903 г.

33. А. К. Сержпутовский, Сказки и рассказы белоруссов-полешуков. СПБ, 1910 г.

34. А. К. Сержпутоўскі, Прымхі і забабоны беларусаў-паляшукоў, Менск, 1930 г.

35. Зап. у к-се „Рассвет", Жлобінскага р., 1936 г.

## ЛЕГЕНДЫ І СКАЗЫ

1. Зап. у в. Заломнае, Жлобінскага р., 1936 г.

2. Зап. у соўгасе Вейно, Грабянёўскага с/с, Магілеўскага р., 1937 г.

3. Зап. у в. Янаўка, Краснапольскага р., 1934 г.

4. Зап. у в. Н. Уюнішча, Казловіцкага с/с, Глускага р., 1938 г.

5. Зап. у Мсціслаўскім р., 1935 г.

6. Зап. у к-се „Рухавік Рэвалюцыі", Крышыцкага с/с, Мазырскага р., 1936 г.

7. Зап. у к-се „Перамога", Старобінскага р., 1937 г.

8. Зап. у Менскім р., 1938 г.

9. Зап. у Менскім р., 1938 г.

10. Зап. у в. Паддубляны, Шумяяскага с/с, Віцебскага р., 1930 г.
11. Зап. у Лельчыцкім р., 1937 г.
12. Зап. у м. Самахвалавічы, Менскага р., 1930 г.
13. Зап. у в. Сідараўка, Пугляеўскага с/с, Аршанскага р., 1938 г.
14. Зап. у Харлалаўскім с/с, Кіраўскага р., 1938 г.
15. Зап. у в. Падляддзе, Дудзіцкага с/с, Рудзенскага р., 1938 г.
16. Зап. у к-се імя Леніна, Касцюкоўскага с/с, Крычаўскага р., 1938 г.
17. Зап. у Менскім р., 1937 г.
18. Зап. у к-се „Беларуская вёска", Лёзненскага р., 1937 г.

## ПЕСНІ

1. Зап. у к-се „Новы Шлях", Жабрыцкага с/с, Крупскага р., 1932 г.
2. Зап. у к-се імя Калініна, Лёзненскага р., 1936 г.
3. Зап. у м. Смалявічы, 1902 г.
4. Зап. у в. Мокравічы, Эсьманскага с/с, Бялыніцкага р., 1936 г.
5. Зап. у к-се „Большэвік," Слабодскага с/с, Магілеўскага р., 1936 г.
6. Зап. у к-се „Чырвоны Маяк", Глоданскага с/с, Лёзненскага р., 1936 г.
7. Зап. у к-се „Большэвік," Слабодскага с/с, Магілеўскага р., 1937 г.
8. Зап. у в. Новы Двор, Менскага р., 1927 г.
9. Зап. у к-се „Стойкі", Глухскага с/с, Быхаўскага р., 1932 г.
10. Зап. у Бельскім с/с, Полацкага р., 1936 г.
11. Зап. у к-се „Новае Жыццё", Крычаўскага р., 1935 г.
12. Зап. у к-се „Новае Жыццё", Халопеніцкага р., 1936 г.
13. Зап. у к-се „Сознание", Зубаўскага с/с, Аршанскага р. 1936 г.
14. Зап. у к-се „Зорка", Клічаўскага р., 1937 г.
15. Зап. у в. Раскачы, Брожскага с/с, Бабруйскага р., 1935 г.

## ПРЫКАЗКІ, ПАГАВОРКІ, ЗАГАДКІ

*(Прынятыя скарачэнні).*

АФС—Архіў фальклорнай секцыі АН БССР. Запісаны ў розных раёнах БССР (1922—1938 гг.)

Н—Носович И. И., Сборник белорусских пословиц, 1866 г.

Ш—Шейн П. В., Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. II, СПБ, 1893 г.

Л—Ляцкий Е. А., Материалы для изучения творчества и быта белоруссов. I—пословицы, поговорки, загадки. М. 1898 г.

С—Сержпутоўскі А. К., Беларускія народныя прыказкі. Архіў фальклорнай секцыі АН БССР (рукапіс).

С П—Сержпутоўскі А. К., Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Менск, 1930 г.

Р—Романов Е. Р., Белорусский сборник, т. XII. Архіў фальклорнай секцыі АН БССР (рукапіс).

Д—Добровольский В. Н., Смоленский этнографический сборник, ч. III, 1894 г.

Ф—Федоровский М., „Lud białoruski..." т. IV, 1935 г.

ЗР — Зинаида Радченко, Гомельские народные песни, 1888 г.

## ЧАСТУШКІ

1—8. Запісаны ў розных раёнах БССР (1922—1938 гг.).

## ЗМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Прадмова. *Акад. Н. М. Нікольскі* | 1 |
| **КАЗКІ І АНЕКДОТЫ** | |
| Бог, баба і мужык | 23 |
| Як поп парабкаў карміў | 24 |
| Папоўскі полудзень | 25 |
| Поп і работнік | 26 |
| „Добры“ поп | 28 |
| Парабкоўскі хлеб | 30 |
| Папоўская проба | 33 |
| Поп-хабарнік | 34 |
| Без грошай то й збавення няма | 35 |
| Як поп маліўся | 36 |
| „Святая“ кніжка | 37 |
| „Свянцоная“ вадзіца | 38 |
| Хітры поп | 39 |
| Хітрыкі ксяндза | 40 |
| Карась | 42 |
| Скупы поп | 43 |
| Завідны поп | 44 |
| Пра папа і дзяка | 46 |
| Як чалавеку ў дзесяць раз вярнулася | 48 |
| Жабрак і кулак | 50 |
| У чым ксяндзу выгада? (Казанне ксяндза) | 52 |
| Даніна на царкву | 53 |
| Папоўскія пропаведзі | 54 |
| Як поп імшу адпраўляў | 55 |
| Выпадковае казанне | [illegible] |

Стар.


Аб папу, што каляд забыўся . 57
Пра папа, дзяка і голуба . 58
Як поп карты рассыпаў . 60
Дзядоўская хітрасць . 62
Што папу было за чужую жонку . 63
Ксёндз, баба і мужык . 64
Споведзь шляхціца . 66
Прошча . 67
Камень „цудоўны" . 69
Поп і барометр . 71


## ЛЕГЕНДЫ І СКАЗЫ


Ленінская праўда . 75
Як мужык-бядняк і рабочы дабіліся сваёй праўды . 79
Жыццё раней і цяпер . 83
„Свяшчонае зелле" . 84
Як царкву будавалі . 85
Як я перастаў верыць у бога . 86
Як дзяцей хрысцілі . 87
Як мы вучыліся. (Сказ старога рабочага) . 88
Служба салдацкая . 90
„Мошчы нятленныя" . 92
Ворагі народа . 94
„Веруючыя" забойцы . 96
„Богаў слуга" . 97
Доля мінулая і жыццё сучаснае . 98
Было ды мінулася гора . 99
Сказ старога калгасніка . 101
Як я стаў бязбожнікам . 103
Жыццё без бога і святых . 108


## ПЕСНІ


А ў Тураве ды на мураве . 113
Песня ўдавы . 114
Горка доля ты батрацкая . 116

Стар.

„Вялікодная песня" . . . . . . . . . 117
Па начам я ўсё не спала . . . . . . . 119
Адпусцілі сялян „на свабоду" . . . . . . 121
Нас буржуі падвялі (Салдацкая) . . . . 122
Патанула горкая доля . . . . . . . . 123
Капліца . . . . . . . . . . . . 124
Спадзяваўся дзед на бога . . . . . . . 125
У калгасе густа рунь зазелянела . . . . . 126
Дзед узяў іконы . . . . . . . . . 127
„Цуд" . . . . . . . . . . . . 128
Мінулася папам свята . . . . . . . . 129
У бога верыць перасталі . . . . . . . 130

## ПРЫКАЗКІ, ПАГАВОРКІ, ЗАГАДКІ

Дарэвалюцыйныя прыказкі і пагаворкі . . 133
Савецкія прыказкі і пагаворкі. . . . . 141
Загадкі (старыя) . . . . . . . . 143
Загадкі (новыя) . . . . . . . . 144

## ЧАСТУШКІ

Непатрэбна нам царква, вучаць кнігі Леніна . . 147
Поп маніў к сабе ў царкву, усім дурманіў галаву . 149
Мы не верым больш у бога, шчасце нам прынёс калгас . . . . . . . . . . . . 151
Замест царквы мы ўжо маем новы, чысты, светлы клуб 160
Няхай поп не дажыдае, нас ажэніць сельсавет . . 165
Бог зусім нам непатрэбен, кажа камсамолачка . . 169
Нават сівы дзед-бязбожнік ўжо не моліцца цяпер . 173
Не хавайся, поп з шпіёнам, маску мы з цябе сарвем. 178

Заўвагі . 183

Надрукавана згодна пастановы прэзідыума Акадэміі навук БССР ад 28/II 1939 г. Адказны карэктар А. Шапіро. Тэхнічны рэдактар В. Свірыдаў. Здана ў вытворчасць 14/III 1939 года. Падпісана да друку 19/IV 1939 года. Фармат паперы 72 × 105 см. Друкаваных аркушаў 6,125. Вучотна-аўтарскіх 5,15. Уп. Галоўлітбела БССР № 271. Тыраж 8000 экз. Заказ № 255/24. Цана 4 руб. 50 к. Пераплёт 1 р. 50 к.

Друкарня Акадэміі навук БССР.

Цѣна 2 руб.